

ЯК ІМ ДАПАМАГЧЫ?

МС



РЫБА НА ЛЮБЫ ГУСТ

19

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЛІСТАПАДА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 219 (29588)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## КОРАТКА

• **Генконсульства Беларусі адкрыюць у Хашыміне.**

• Акцыя «Нашы дзецi» ў Гомельскай вобласці адкрыецца кадэцкім балем.

• **Вакцыну супраць COVID-19, якая прыбыла з Пекіна, пачнуць размяркоўваць па рэгіёнах на наступным тыдні.**

• Прыватны сектар забяспечыў за 9 месяцаў 78,6 працэнта паступленняў у бюджэт Мінска.

• **Першую дозу вакцыны ад COVID-19 атрымалі больш за 30 % насельніцтва Беларусі.**

• Дзіцяня ламы з'явілася на свет у Мінскім заапарку.

• **У Гродзенскай вобласці за 10 месяцаў затрымалі больш як 1,5 тыс. нецвярозых кіроўцаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр БУРАК, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*«Якасць — гэта найважнейшая задача нашай эканамічнай палітыкі. У сучасных няпростых умовах, якія характарызуюцца агрэсіўнай глабальнай канкурэнцыяй, узмацненнем сусветных гандлёва-эканамічных сувязяў, хуткай зменай тэхналогій, істотным скарачэннем тэрмінаў вываду прадукцыі на рынак, менавіта якасць з'яўляецца вызначальным арыенцірам канкурэнтнай устойлівасці эканомікі краіны ў цэлым і кожнай арганізацыі паасобку».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы не павінны, абараняючы свой суверэнітэт і незалежнасць, спыняцца ні перад чым»

Прэзідэнт Беларусі правёў чарговую нараду з кіраўніцтвам Савета Міністраў

**На асобнае абмеркаванне вынесены тэмы, пры рашэнні якіх узніклі пытанні. Сярод такіх — рэфармаванне прадпрымальніцкай дзейнасці ў сферы малога бізнесу, меры дзяржпадтрымкі ААТ «Амкадор» і будаўніцтва новага вучэбнага корпуса БДУ. Але напачатку разгледзелі тэмы надзённыя: сельская гаспадарка, міграцкі крызіс на граніцы, еўрапейскія санкцыі і пандэмія.**



Фота БелТА.

## СТРАТЭГІЧНЫЯ ЗАДАЧЫ НА ЗІМУ

Уборка ўраджаю амаль скончана. Засталося сабраць невялікія ўчасткі кукурузы на збожжа ў моцных гаспадарках з добрай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Па словах Прэзідэнта, яны за дзень-два могуць гэта зрабіць, але мяркуюць пачакаць, каб скараціць потым сушку зерня.

Стаяць на палях яшчэ цукровыя буракі (5 % ад іх плошчаў), дадае кіраўнік краіны. «Мы маглі б сабраць даўно цукровыя буракі. Але мы перагрузім цукровыя заводы, і ў буртах будуць ляжаць гэтыя буракі, а пры цёплым надвор'і могуць сапсавацца», — тлумачыць Прэзідэнт.

Ён мяркуе, што гаспадаркі атрымаюць сёлета каля 4 мільёнаў тон цукровых буракоў. Унутраны рынак забяспечаць цукрам поўнасцю (гэта прыкладна 350 тысяч тон). Столькі ж пойдзе на экспарт — цэны на цукар добрыя, што дапаможа паправіць фінансавы стан гаспадарак, кажа Аляксандр Лукашэнка.

«*__Збожжа мы збяром прыкладна дзевяць мільёнаў тон. Маю на ўвазе зерне каласавых (пшаніца, трыцікале, жыта, ячмень, авёс і іншае), кукуруза — амаль 1,5 мільёна тон і рапс — 750—800 тысяч па краіне. Гэта нядрэнны ўраджай па гэтым годзе__*. Дастаткова, каб забяспечыць насельніцтва хлебам і кармамі пагалоўе жывёлы», — падагульняе Прэзідэнт.

Па яго словах, добра паўплывала на глебу зяблівае ўзворванне — амаль 80 % паднята зяблівa пад план. Аляксандр Лукашэнка хваліць аграрыяў, але просіць не спыняцца.

«Малайцы гаспадаркі, што ўносяць арганіку пад зябліва. Гэта добра. І цяпер традыцыйна калій-ныя ўгнаенні мы ўносім пад зябліва. Тэхналогіі выконваюцца. Неабходна толькі больш якасна араць», — заўважае кіраўнік краіны.

СТАР. 2

Жыллё

# Рынак жывы, але ў напаўсонным стане

Цэны на кватэры працягваюць павольна паўзці ўніз

**Пасля ўдалага для рынку нерухомасці летне-восеньскага сезона, калі попыт на кватэры толькі рос, а страхі перад «каронай» супакоіліся, у буйныя гарады зноў прыйшоў вірус. Па словах дырэктара агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, сітуацыя з актыўнасцю пакупнікоў жылля кардынальна змянілася. Больш за тое, калі пакупнікі, надзеўшы маскі і пальчаткі, згаджаюцца на агляд кватэр, то прадаўцы ўсё часцей на кантакт ісці адмаўляюцца.**

За летні сезон і пачатак восені «парк» свабодных і танных кватэр істотна паменшыўся. За гэты час была амаль «вымыта» з рынку такая катэгорыя жылля, як бюджэтныя кватэры. Па падліках нашага эксперта, сёння пакупніцкая актыўнасць у сталіцы ўпала дзесьці на 20—30 % у параўнанні з вераснем. І калі пакуль колькасць зарэгістраваных здзелак застаецца высокай (за кошт масавых аглядаў кватэр летам), то праз месяц–два гэты паказчык будзе імкліва падаць. Мяркуйце самі. У верасні было зафіксавана 1300 здзелак, у кастрычніку — 1240 здзелак, у першую дэкаду лістапада — ужо ўсяго толькі 250 продажаў.

СТАР. 4

Прыклад для пераймання

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ БУТЭЛЬКІ

**Як вясковыя жыхары самастойна арганізавалі збор шкла і пластыку**

**У прыватным сектары Новага Поля, што ў Мінскім раёне, няма кантэйнераў для раздзельнага збору смецця. Затое ёсць ініцыятыўныя і незвычайныя жыхары. Яны не толькі ачысцілі вёску ад шкла і пластыку, але і прыдумалі, як падарыць бутэлькам другое жыццё. І цяпер ахвотна дзеляцца сваім вопытам з іншымі.**

СТАР. 5

Дар'я ЧЫБУЕВА з мужам і дзецьмі.



# «Мы не павінны, абараняючы свой суверэнітэт і незалежнасць, спыняцца ні перад чым»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт пералічыў ураду асноўныя задачы ў сельскай гаспадарцы. Першае — трэба за зіму падрыхтавацца і пасеяць зерне як мага раней. «Неабходна хутка кінуць зерне ў глебу. Імгненна. Вядома, трэба, каб прагрэлася глеба да плюс дзесяці, каб пасеяць кукурузу. А то мы ж месяц сеем! І збіраем пасля да снежня. Калі «паспела» глеба, трэба кукурузнае зерне кідаць туды і днём, і ноччу», — тлумачыць Аляксандр Лукашэнка.

Другая задача — своечасовая падкормка азімых культур. Па словах Прэзідэнта, халодная, бясснежная зіма небяспечная для азімых культур, таму іх неабходна як мага раней потым падкарміць. «Вы павінны падрыхтаваць агрэгаты, якія могуць выйсці ў вільготную глебу, — заўважае кіраўнік краіны. — Калі іх не хапае, неабходна за зіму закупіць».

Яшчэ адно тактычнае пытанне — вызначыць цэнтры, куды звязуць энерганасычаную тэхніку для аднаўлення і рамонту. Гэтую задачу ўскладуць на МТЗ, «Гомсельмаш» і «Амкадор».

«Я прасіў міністра прамысловасці і віцэ-прэм'ера, каб страты на аднаўленне і рамонт гэтай тэхнікі былі мінімальныя. У сялян лішніх грошай няма», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

Далей — меліярацыя. Прыступаць да яе, найважнейшай справы ў сельскай гаспадарцы, неабходна фронтам, мяркуе кіраўнік краіны.

«Захаванне ўрадлівасці глебы і ўвогуле захаванне земляў — гэта святы абавязак дзяржавы. Неабходна вызначыць за зіму ўсе крыніцы фінансавання і вызначыць цану гектара аднаўлення меліяраваных земляў», — ставіць задачу Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, прырода адваёўвае па краіне тысячы гектараў урадлівых земляў, якіх калгасам ужо не хапае. Самая вялікая меліярацыя, верагодна, будзе ў Мінскім раёне.

«Тут ад Мінска адляціш кіламетраў 20-30-50-60, асабліва бліжэй да Бярэзіны, Барысаўскага раёна, — страшна глядзець», — заўважае Прэзідэнт.

Мяркуе ён правесці для кожнага губернатара ў будучым годзе свайго роду экзамен наконт аднаўлення сельскагаспадарчых тэхнік райаграсэрвісаў, неабходных для АПК.

«Вызначыцеся за зіму, якімі яны павінны быць, і аднавіце іх», — рэзюмуе тэму кіраўнік краіны.

## ПРЭЗІДЭНТ ДАРУЧАЕ ПАДТРЫМАЦЬ МІГРАНТАЎ

Наступная тэма для абмеркавання — дзяржаўная граніца. Прэзідэнт адзначае, што праблемы там не такія вялікія, як падаюць СМІ, але падзеі маюць «характар папераджальны».

«***Такіх маршрутаў 3—5 у свеце, па якіх ідуць мільёны тых, хто бяжыць ад вайны. Сканцэнтравалі ўвагу зараз на беларуска-польскай, беларуска-літоўскай, беларуска-латышскай граніцах. Увагу пачынаем удзяляць і беларуска-ўкраінскай граніцы.*** Яна таксама хвалюе і мяне, і Расію», — дадае Прэзідэнт.

Ён хваліць СМІ, якія асвятляюць падзеі, за тое, што «паказалі сапраўдны твар дэмакратыі».

«Нарэшце, і вы, хто тут сядзіць, і асабліва наша грамадства зразумее, што ж гэта за дэмакратыя, правы чалавека, свабода слова там, на Захадзе, за што нас штурхалі», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт даручае віцэ-прэм'еру, міністру адукацыі, спікеру Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай заняцца паляпшэннем умоў жыцця цяжарных жанчын і дзяцей мігрантаў, што знаходзяцца на граніцы.

«Мы нікуды не дзенемся, нараджаць яны, верагодна, будуць у нас. Сыходзіць з гэтага лагера яны не хочуць. Ну як тут? Мы ж ведаем, якія халады наступаюць. Яны не ведаюць, што такое зімаваць у лясах. Але сыходзіць не хочуць», — сцвярджае Прэзідэнт.

Ён прапаноўвае дзяцей, цяжарных жанчын пасяліць у санаторыі. Віцэ-прэм'ера Юрыя Назарава Прэзідэнт просіць падвезці да лагера сухіх дроў. «Па-першае, ім трэба сагрэцца. А, па-другое, яны ж увесь хмызняк вакол пазбіралі, пачнуць сячы дрэвы», — падкрэслівае Прэзідэнт.

Задача для МЗС ад Прэзідэнта — жорстка ўздымаць тэму мігрантаў у ААН і іншых міжнародных структурах.

Паводле яго слоў, на граніцы знаходзяцца 1790 мігрантаў і 322 чалавекі з польскага боку.

Акрэслівае кіраўнік краіны і адну вельмі небяспечную тэндэнцыю на граніцы. «Гэта пытанне нашых ваенных і Камітэта дзяржбяспекі. ***Пайшлі спробы перакідвання зброі, боепрыпасаў і ўзрыўчаткі гэтым людзям у лагерах.*** Двое сутак перакідваюць зброю. Мы з расіянамі трымаем на кантролі гэта пытанне. Зброя ў асноўным ідзе з Данбаса. Для чаго? Хочуць зладзіць правакацыю, сутыкнуць ілбамі нашых пагранічнікаў з іхнімі. Вымушаны па перыметры кантраляваць сітуацыю, каб ім не закінулі зброю», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

Ён звяртае ўвагу на вайсковы характар курдскай народнасці, таму што большасць мігрантаў — менавіта курды. «Любы аўтамат, пісталет, правакацыя — і ваенны канфлікт. Тут міністр абароны прысутнічае, прашу звязацца з Тэртэлем (старшыня КДБ. — «**Зв.**») вызначыце меры бяспекі, каб у такія групы не трапіла зброя і ўзрыўчатка, бо будзе бойня», — канстатуе Прэзідэнт.

Яшчэ адна задача для сілавікоў — забяспечыць кантроль за прасоўваннем войскаў НАТА і Польшчы, якія падцягнуліся да беларускай граніцы без папярэджання.

«Вы павінны іх бачыць, і ў вас павінны быць планы супрацьдзеяння, калі, не дай бог, нешта здарыцца. Мы не разгортваем сваю групоўку ваенных сіл, але бачыць і прадбачыць мы павінны, каб нам там не зладзілі вайнушку, а мы акажамся да гэтага не гатовыя», — адзначае кіраўнік краіны.

Ён паведаміў, што папрасіў Прэзідэнта Расіі падключыць расійскіх ваенных да дзяжурства на граніцы Саюзнай дзяржавы. «Яны накіравалі сюды стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі ў суправаджэнні нашых знішчальнікаў. Мы павінны пастаянна маніторыць сітуацыю на граніцы», — заўважае Аляксандр Лукашэнка.

Ён расказвае, што мігрантаў з памежных краін імкнуцца выкідваць на тэрыторыю Беларусі, а паверх галоў у нашым кірунку адкрываюць стральбу.

«У савецкія часы, калі б толькі з памежнай тэрыторыі ў наш бок быў заўважаны хоць адзін стрэл, сцерлі б усё з твару зямлі. Гэта страшнае парушэнне дзяржаўнай граніцы», — адзначае кіраўнік краіны.

## «МЫ ІМ НІЧОГА ПРАБАЧАЦЬ НЕ ПАВІННЫ»

Прэзідэнт не абмінуў тэму санкцый, адзначыўшы, што пачалі пужаць Беларусь іх пятым пакетам.

«На гэты пяты пакет вам, Раман Аляксандравіч (Галоўчанка, прэм'ер-міністр. — «**Зв.**»), было даручэнне. Мы ім нічога прабачаць не павінны. Польшча нас пужае, што закрые граніцы. Калі ласка. Закрывайце, менш збеглых туды будзе перамяшчацца», — кажа Прэзідэнт.

Ён тлумачыць апанентам, што здарыцца, калі Беларусь закрые свой транзіт. «Праз Украіну не пройдзеш, там расійская граніца закрытая. Праз Прыбалтыку да Эстоніі дарог няма. Калі мы закрыем для палякаў і, напрыклад, немцаў, што будзе тады? Мы не павінны, абараняючы свой суверэнітэт і незалежнасць, спыняцца ні перад чым», — адзначае Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, пракачка газу праз Беларусь паявлічана амаль у два разы. «***Мы абагравалем Еўропу, а яны нам пагражаюць закрыць граніцу. А калі мы перакрыем прыродны газ туды?*** Перад тым, як рабіць заявы, я кіраўніцтву Польшчы, літоўцам парэкамендаваў бы думаць перад тым, як казаць», — сцвярджае Прэзідэнт і дадае, што Беларусь будзе адказваць на непрымальныя санкцыі.

## «НЕ РАССЛАБЛЯЙЦЕСЯ»

Чарговае пытанне, на жаль, прывычнае — пандэмія. Прэзідэнт канстатуе спад захваральнасці нават у Мінску, але просіць: «Не расслабляйцеся. Мы не ведаем, як паводзяць сябе гэтыя вірусы, як адгукнецца на нашым грамадстве грып. Ковід падавіў грып, але не ведаем, як будзе далей».

Ён падкрэслівае, што шмат цяжкахворых у сталіцы, а смяротнасць недапушчальная.

«Хворых паменшылася. Дзе-ніздзе нават значна. Трэба ўводзіць у нармальную работу бальніцы, вызваляць ад ковіду аддзяленні і ложкі. Хай бальніцы ў поўным аб'ёме прыступаюць да планавых аперацый. Трэба канцэнтраваць у некалькіх бальніцах у Мінску ковідных хворых і іх лячыць, а астатнія вымыць», — даручае Прэзідэнт.

Ён звяртае ўвагу на неабходнасць эканоміі кіслароду, лекаў, ахоўных сродкаў. Кіраўнік краіны нагадвае, што да канца года з усіх крыніц патрацяць два мільярды долараў на пандэмію. Але пры гэтым ніхто не плаціць ні за лячэнне, ні за вакцынацыю.

«Усе крычаць: «Пфайзер, Пфайзер, давайце прышчэпку». Не ведаю, каму гэта трэба. У нас ёсць добрыя вакцыны. Ніхто не спытаў, па колькі нам флаконччык гэтага Пфайзера прапаноўваюць. Ад 20 да 30 долараў толькі за адну ін'екцыю. У нас свая вакцына напалову таннейшая. Тое ж самае з тэсціраваннем. Не трэба крычаць. Урачы ведаюць, як лячыць і чым вакцынаваць», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважае, што вакцынацыя ўжо стала палітыкай, і пачалася бойка вакцын. «Гэта ж велізарныя грошы, таму кожны хоча ўцюхаць сваю», — дадае ён.

## «БЯСШОЎНЫЯ» ЗМЕНЫ

Адной з тэм нарады стала рэфармаванне прадпрымальніцкай дзейнасці. Тут Прэзідэнтам была пастаўлена задача павысіць ступень удзелу суб'ектаў малога прадпрымальніцтва ў фінансаванні дзяржаўных расходаў — падаткі павінны плаціць усе. Урадам былі выпрацаваны пэўныя падыходы, і на зацвярджэнне кіраўніка краіны ўнесены праект Указа «Аб дзейнасці суб'ектаў малога прадпрымальніцтва».

«***Суб'екты малога прадпрымальніцтва адыгрываюць істотную ролю ў нашай эканоміцы: стварэнне новых працоўных месцаў, паскарэнне эканамічнага росту.*** У тым ліку за кошт пераразмеркавання працоўных рэсурсаў з малаэфектыўных сектараў», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

Дзяржаўная задача, дадае ён, — забяспечыць такія ўмовы, каб пераходныя працэсы праходзілі «бясшоўна», з мінімальнымі эканамічнымі стратамі і прагназаванай сітуацыяй у прадпрымальніцкім асяроддзі.

«Да падпісання ўказа — праект на стале — хацеў бы ў шырокім складзе публічна абмеркаваць, наколькі пераканаўчыя прадстаўлены доказы і ці ёсць ва ўрада дакладнае разуменне сітуацыі, алгарытм далейшых дзеянняў у сферы малога прадпрымальніцтва», — канстатуе кіраўнік краіны.

Таксама ён задае пытанні прадстаўнікам Саўміна: якія навацыі прадугледжаны ў праекце ўказа, які эфект трэба чакаць пасля яго падпісання, як прапанаваныя змены крытэрыяў малога прадпрымальніцтва адаб'юцца на дзелавым клімаце і ўзроўні эканамічнай актыўнасці, асабліва ў рэгіёнах?

Кіраўнік краіны адзначае, што работа ў ценявым сектары больш недапушчальная. «У выніку мы павінны мець яснае ўяўленне аб далейшых этапах карэкціроўкі падаткаабкладання ўсіх суб'ектаў малога бізнесу. Пры гэтым за спробамі паляпшэння мы павінны бачыць найперш інтарэсы нашых грамадзян, — заяўляе Прэзідэнт. — Гэта не значыць, што мы зараз непасільным ярмом падаткаў абкладзём малое прадпрымальніцтва і прадпрымальніцтва ўвогуле. Нам гэта не трэба. Нам трэба, каб і малое, і сярэдняе, і буйное прадпрымальніцтва развівалася, каб іх больш з'яўлялася ў Беларусі і маглі плаціць падаткі».

## НЕ СЦЭНЫ, А ЗМЕСТ

Таксама на нараду вынесена аказанне мер дзяржаўнай падтрымкі ААТ «Амкадор». Яшчэ адным пытаннем у парадку дня стаяла тэма будаўніцтва новага вучэбнага корпуса БДУ.

«Для Рэспублікі Беларусь з яе экспартаарыентаванай эканомікай крытычна важна, каб сістэма адукацыі была гарантам высокага прафесійнага ўзроўню спецыялістаў», — акцэнтуе Прэзідэнт.

Урадам унесена прапанова аб будаўніцтве новага корпуса для ўніверсітэта за кошт крэдытных рэсурсаў. «Хацеў бы пачуць дадатковыя аргументы па гэтым пытанні. Я ж разумею, крэдытныя рэсурсы — гэта пад гарантыю ўрада, лічы, за дзяржаўны кошт. Скажу проста: ці можам мы ў гэты няпросты час абысціся без гэтага корпуса? А магчыма, мы ў Мінску нешта знойдзем для функцыянавання гэтага факультэта...» — заявіў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Блізкая ўлада

# ТЭЛЕФАНУЙЦЕ Ў СУБОТУ



**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 13 лістапада, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

Кантэкст

# «Я СПАЎ У ПАЛАТЦЫ, А МОЙ БРАТ — НА ГОЛАЙ ЗЯМЛІ»

## Сітуацыя на беларуска-польскай граніцы застаецца напружанай

**На лініі граніцы каля польскай агароджы знаходзіцца вялікая група бежанцаў, сярод якіх шмат жанчын і маленькіх дзяцей. «На працягу сутак да стыхійнага лагера прыбылі некалькі невялікіх груп, у агульнай колькасці амаль 200 чалавек, — расказалі ў Дзяржпагранкамітэце — У цэлым сітуацыя застаецца напружанай. Умовы надвор'я, недахоп ежы і вады ствараюць пагрозу фізічнаму стану людзей, якія шукаюць абароны ў краінах ЕС. За мінулыя суткі непасрэдна ў лагеры бежанцаў аказана медыцынская дапамога дзвюм жанчынам з-за пераахаладжэння і траўмы галавы. Таксама ўначы медыкі пагранічнай службы дапамаглі дзіцяці, у якога былі выяўлены прыкметы пераахаладжэння. Распаўсюджаная інфармацыя аб выпадку гібелі сярод бежанцаў не адпавядае рэчаіснасці».**

Для аказання экстраннай дапамогі, асабліва ў начны час сутак, з-за істотнага паніжэння тэмператур паблізу лагера пастаянна дзяжурыць медыцынскія брыгады. Таксама з улікам існуючых магчымасцяў пасільная падтрымка бежанцаў прадуктамі харчавання аказваецца з боку беларускіх улад, гуманітарных арганізацый і валанцёраў. «З польскага боку знаходзяцца ваеннаслужачыя, якія не дапускаюць прадстаўнікоў СМІ, міжнародных і гуманітарных арганізацый для аказання дапамогі бежанцам і вырашэння цяперашняй сітуацыі», — паведамілі ў ДПК.

Амаль усе дзеці ў лагеры прастуджаныя, дужа халодныя ночы. Аб гэтым карэспандэнту БелТА расказаў 14-гадовы бежанец, які разам з сям'ёй засеў у стыхійным лагеры каля польскай граніцы. «Мы ідзём у Германію або Вялікабрытанію. Прасілі, каб Польшча прапусціла нас. У адказ палілі газам мяне, маму, братоў — усіх без разбору», — распавёў бежанец. Ён паскардзіўся на складаныя ўмовы ў лагеры, найперш на холад. «Я сёння спаў у палатцы, а мой брат — на голай зямлі, — заўважыў малады чалавек. — Мы ўдзячныя беларусам. Нам даставілі ваду, дзеляцца ежай. Але вельмі цяжка пераносіцца холад».

Прадстаўнікі Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў азнаёміліся з сітуацыяй у лагеры бежанцаў на граніцы з Польшчай. «Сітуацыя катастрафічная, і праз дзень яна будзе яшчэ горшая, думаю. Неабходна нешта рабіць. Пастаўкі гуманітарнай дапамогі будуць прадоўжаны», — адзначыў прадстаўнік УВКБ ААН у Беларусі Мулусеў Мамо. Ён падкрэсліў, што ўмовы, якія склаліся ў лагеры, не самыя лепшыя. Сустрэлася з бежанцамі і прадстаўнік міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Рэспубліцы Беларусь Махым Аразмухамедава. Паводле яе слоў, краінам неабходна звярнуць увагу на гуманітарны кантэкст і гуманнае вырашэнне і ўрэгуляванне сітуацыі. Важна, адзначыла Махым Аразмухамедава, прадоўжыць аказанне гуманітарнай дапамогі з улікам індывідуальнасцяў і правоў кожнага з людзей.

Раней сакратар Святога Прастола па адносінах з дзяржавамі (кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Ватыкана) архібіскуп Пол Рычард Галахер у сувязі з крызісам на польска-беларускай і літоўска-беларускай граніцы заклікаў еўрапейскія ўлады ўзяць на сябе адказнасць у пытаннях мігрантаў і бежанцаў, паведаміла РІА «Навіны». «Мы заклікаем усе бакі прыняць на сябе адказнасць і вырашыць гэты вельмі сур'ёзны гуманітарны крызіс», — сказаў сакратар Святога Прастола. Пол Рычард Галахер таксама заклікаў краіны Еўрасаюза праявіць гуманныя адносіны да мігрантаў. «Што датычыцца пазіцыі царквы, мы ведаем, што, напрыклад, у Польшчы царква крытыкуе падыход урада да гэтага пытання і спрабуе заклікаць улады да больш гуманнага і гібкага падыходу, — цытуе ТАСС сакратара Святога Прастола. — Я заклікаю ўсіх глядзець на гэту сітуацыю не ў колькасных адносінах, а з пункту гледжання лёсаў людзей, такіх жа, як мы, якія сутыкнуліся з вельмі сур'ёзнай сітуацыяй».

Як стала вядома, каталіцкая царква ў Польшчы выступіла за правядзенне агульнанацыянальнай кампаніі па зборы сродкаў для мігрантаў на граніцы з Беларуссю. Грошы, якія плануецца сабраць ва ўсіх польскіх касцёлах, будуць перададзены дабрачыннай арганізацыі для забеспячэння ў прыгранічным рэгіёне на паўночным усходзе Польшчы перадумоў «доўгатэрміновай інтэграцыі бежанцаў», якія хочуць застацца ў Польшчы.

Пры нармальных адносінах, разумее Беларусь гатова сумесна з палякамі вырашаць праблему бежанцаў. Аб гэтым у эфіры «Альфа Радыё» заявіў старшыня праўлення беларускага таварыства «Веды» Вадзім Гігін. Разважаючы пра міграцыйны крызіс, ён адзначыў, што Парыж, Рым, Мадрыд і іншыя еўрапейскія цэнтры сілы не спяшаюцца дапамагаць Варшаве, паколькі ў тым ліку помсцяць ёй за яе даўнюю лінію адносна бежанцаў. «Праявіць салідарнасць — гэта ўзяць і размясціць бежанцаў па розных краінах ЕС. Чаму яны з гэтым не спяшаюцца? Гэта такая салодкая помста Польшчы і прыбалтыйскім краінам, таму што, калі быў крызіс у 2015—2016 гадах, яны нахабна, ганарліва, фанабэрыста заяўлялі, што мы нікога не прымем, не для таго мы ўступалі ў ЕС, каб бежанцаў прымаць у сябе. І не прынялі ў выніку. Таму, думаю, цяпер у Мадрыдзе, Рыме, Афінах, Парыжы з вялікай цікавасцю назіраюць, як Качыньскі, Наўседа, Ландсбергіс і іншыя будуць самі спраўляцца з гэтым выклікам», — заўважыў Вадзім Гігін. Акрамя таго, аналітык звярнуў увагу на яшчэ адзін важны момант, які на Захадзе лічаць за лепшае замоўчваць. «Трэба адкрыта сказаць, куды, чаму ідуць бежанцы і чаму з'явіўся гэты паток. Арганізаваная ўстойлівая мафіёзная структура, якая базіруецца перш за ўсё на тэрыторыі Польшчы. І польскія ўлады аб гэтым цудоўна ведаюць. У гэтай структуры ёсць адгалінаванні ў Іраку, Германіі. Беларускія ўлады, як мы ведаем, за апошні час затрымалі каля 15 чалавек, якія арганізоўваюць гэтыя нелегальныя патокі. Там ёсць украінцы, палякі, ліванец, яшчэ хтосьці, але беларусаў няма. Вось у чым справа», — падкрэсліў Вадзім Гігін.

Праўда, пакуль да ўзважанага дыялогу далёка. Міністэрства абароны фіксуе абсалютна неадэкватную рэакцыю кіраўніцтва Польшчы наконт вырашэння той сітуацыі. «Замест дыялогу і прыняцця дзейсных мер па вырашэнні міграцыйнага крызісу нашы суседзі прадаўжаюць беспрэцэдэнтнае нарошчванне сілавога складніка каля граніц Беларусі, — адзначылі ў Мінабароны. — Засяроджванне 15 тысяч ваеннаслужачых, танкаў, сродкаў ППА, іншага цяжкага ўзбраення нельга назваць адэкватнай рэакцыяй. Больш гэта нагадвае стварэнне ўдарных груповак войскаў. Дзеянні польскіх ваенных ідуць уразрэз усіх міжнародных і двухбаковых дамоўленасцяў».

Улічваючы нежаданне ваеннага кіраўніцтва Польшчы ісці на дыялог, адхіленне нашых крокаў, накіраваных на вырашэнне пытанняў у рамках міжнародных нормаў, а таксама неабгрунтаваныя абвінавачанні ў адрас Узброеных Сіл і Рэспублікі Беларусь у цэлым, беларускае ваеннае ведамства вымушана прымаць адэкватныя меры рэагавання як самастойна, так і ў рамках наяўных дамоўленасцяў з нашым стратэгічным саюзнікам. «Мы не будзем бразгаць зброяй, у адрозненне ад нашых суседзяў. Створаная сістэма рэагавання на падобныя выпадкі дазваляе нам зрабіць усё, каб абараніць суверэнітэт і незалежнасць краіны, — заявілі ў Мінабароны. — Нашым суседзям Узброеныя Сілы Беларусі раяць спыніць істэрыю і ашалелы мілітарызм і пайсці па шляху вырашэння ўсіх пытанняў у рамках дыялогу».

**Пётр ДУНЬКО.**

### Тым часам

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народ Польшчы з Нацыянальным святам незалежнасці.**

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя міралюбівага і шматнацыянальнага народа Беларусі і сябе асабіста павіншаваў народ Польшчы з Нацыянальным святам незалежнасці. Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Спрадвеку нашы нацыі звязваюць трывалыя вузы, заснаваныя на агульнасці духоўных і культурных каштоўнасцяў, добрасуседскіх гуманітарных і эканамічных кантактах, — адзначаецца ў віншаванні. — На працягу стагоддзяў беларуска-польскае ўзаемадзеянне набывала дадатковую вартасць дзякуючы бясцэнным капілярам разнастайных чалавечых адносін».

Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што і ў цяперашніх абставінах, нягледзячы на палітычную кан'юнктуру, жорсткія выклікі і пагрозы, шляхам адкрытасці і рацыянальнага дыялогу, непрадузятага погляду на мінулае і сучаснасць народы дзвюх краін здольны разам рэалізаваць прагматычныя аб'яднальныя ідэі.

«Перакананы, што прынцыпы неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы, знакавыя інвестыцыйныя праекты, сумесная праца на міжнароднай арэне на карысць стабільнасці і бяспекі паслужаць сапраўднаму ўмацаванню незалежнасці і суверэнітэту нашых краін, стануць цвёрдым падмуркам для захавання міру і канструктыўнага супрацоўніцтва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар пажадаў народу Польшчы салідарнасці, дабрабыту і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інфляцыя ў ЗША паскорылася да 30-гадовага максімуму

Спажывецкія цэны (індэкс CPI) у ЗША ў кастрычніку ўзраслі на 6,2 працэнта адносна таго ж месяца мінулага года. Пра гэта сведчаць даныя Міністэрства працы краіны. Паказчык дасягнуў максімальнага значэння з лістапада 1990-га. Цэны на энерганосьбіты ў кастрычніку падскочылі на 30 працэнтаў, на прадукты харчавання — на 5,3 %. Інфляцыя паскараецца: індэкс CPI вырас на 0,9 % адносна папярэдняга месяца. Як падкрэсліла газета The Hill, эксперты чакалі больш нізкіх тэмпаў росту інфляцыі. Узровень спажывецкіх цэн у ЗША застаецца занадта высокі. Пра гэта заявіў амерыканскі прэзідэнт, выступаючы ў Балтыморы (штат Мэрыленд), паведаміла ТАСС. «Усё — ад галона бензіну да бохану хлеба — каштуе даражэй», — сказаў Джо Байдэн.

### Ад залеў у Індыі і Шры-Ланцы загінула больш за 40 чалавек

Пра гэта паведамляе агенцтва Reuters. У прыватнасці, праз залевы ў астраўной дзяржаве Шры-Ланка загінулі 25 чалавек, большасць з іх патанула. Паведамляецца таксама аб пацярпелых у выніку апоўзняў. У паўднёвым індыйскім штаце Тамілнад ахвярамі лівеню сталі 16 чалавек. Раней таксама паведамлялася аб 50 тысячах пацярпелых. За апошні месяц у Тамілнадзе было зарэгістравана перавышэнне нормы ападкаў на 43 працэнты. У сувязі са стыхіяй у штаце быў аб'яўлены найвышэйшы рэжым трывогі. Метэаралагічны дэпартамент Індыі раней паведамляў, што верасень і кастрычнік сталі рэкорднымі па колькасці дажджоў у краіне за апошнія пяць гадоў. Эксперты адзначылі, што прычынамі анамальна высокай колькасці дажджоў сталі затрымка з заканчэннем мусоннага перыяду і ўзнікненне вялікай колькасці зон нізкага ціску на тэрыторыі краіны.



### У возеры ў Вісконсіне знайшлі 1200-гадовае каноэ

Добра захаванае каноэ, узрост якога прыкладна ацэньваецца ў 1200 гадоў, знайшлі на дне возера Мендота ў Мэдысане, што ў амерыканскім штаце Вісконсін. Як паведаміла The Guardian, 4,5-метровае судна адшукалі дайверы на глыбіні 27 футаў (каля 8,2 метра). Яно добра захавалася, бо не ляжала ўвесь гэты час на сонцы. Продкі індзейцаў віннебага (ха-чанк), якія жылі ў гэтым раёне, будавалі каноэ, выпальваючы ўнутраную частку бярвення, а пасля выскрабалі драўніну. Навукоўцы адзначаюць, што на тое, каб сціплаваць каменнай прыладай вялікае дрэва і апрацаваць яго, было неабходна сотні гадзін. Акрамя таго, каб прымусіць атрыманую канструкцыю трымацца на вадзе, былі патрэбны спецыяльныя навыкі.

## Інсулін у форме картрыджаў

**будуць атрымліваць усе пацыенты ў Беларусі з цукровым дыябетам, у тым ліку другога тыпу, да 2025 года.**

Аб гэтым паведаміла ўчора **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння, галоўны пазаштатны спецыяліст па эндакрыналогіі Міністэрства аховы здароўя Вольга САЛКО**.

«У мінулым годзе Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла канцэпцыю забеспячэння інсулінам пацыентаў з цукровым дыябетам. У адпаведнасці з ёй да 2025 года ўсе пацыенты, якія маюць патрэбу ў лячэнні, павінны атрымліваць інсулін у картрыджнай форме», — сказала Вольга Салко, растлумачыўшы, што такая форма значна больш зручная для пацыентаў, чым флаконная.

У гэтым годзе інсулінам у картрыджах дадаткова забяспечаны больш як 4 тысячы пацыентаў з цукровым дыябетам першага тыпу. У 2022-м прэпарат у новай форме атрымаюць усе пацыенты з дыябетам першага тыпу.

Міністэрства аховы здароўя прыняло рашэнне пашырыць паказанні да аналагаў інсуліну. У гэтым годзе ўжо ўсе дзеці і каля 50 % дарослых з цукровым дыябетам першага тыпу забяспечаны аналагамі інсуліну. Разам з тым Вольга Салко заўважыла, што інсулінатэрапія і цукрапаніжальныя прэпараты не адзіны кампанент лячэння. Важна тэрапеўтычнае навучанне пацыентаў.

# Рынак жывы, але ў напаўсонным стане

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### НОВАБУДОЎЛІ ДАРАЖЭЙШЫЯ, АЛЕ СОЧАЦЬ ЗА ТЭНДЭНЦЫЯМІ І ЯНЫ

За апошні тыдзень на сталічным рынку кватэр індэкс цэн другаснага жылля знізіўся на 0,1 % і склаў 1214 долараў за квадратны метр. Сярэдняя цана кватэр у новабудоўлях Мінска таксама знізілася на 0,5 % і роўная на дадзены момант 1336 доларам за «квадрат». Такім чынам, разрыў паміж сярэднім узроўнем цэн першаснага і другаснага рынкаў складае 122 долары за квадратны метр на карысць новабудоўляў.

Калі разглядаць сярэднюю цану ўсіх кватэр (другасны рынак плюс новабудоўлі), то атрымліваецца досыць стабільная сітуацыя. Аднапакаёвыя кватэры цяпер прадаюць (у сярэднім) па 38 тысяч долараў, двухпакаёвыя — 60 тысяч 600 долараў, а трохпакаёвыя — 76 тысяч 200 долараў. Варта адзначыць, што за апошні час маленькія кватэры практычна не змянілі свайго кошту, двухпакаёвыя нават трохі падаражэлі, а іншыя апартаменты нязначна патаннелі.

Наш эксперт адзначае, што ўпершыню з пачатку кастрычніка цэны на кватэры ў беларускай сталіцы паказалі невялікае зніжэнне. Не апошнюю ролю тут іграе рост аб'ёму прапановы. А значыць...

Гэта факт. Аб'ём прапановы расце дзявяты тыдзень запар: толькі за мінулы тыдзень колькасць аб'ектаў нерухомасці ў базе павялічылася яшчэ на 3,5 %. Галоўным чынам гэта адбылося за кошт росту колькасці аб'яў аб продажы аднапакаёвых кватэр (плюс 3 %) і трохпакаёвых кватэр (плюс 2 %). Колькасць двухпакаёвых кватэр, наадварот, за апошнія сем дзён нават скарацілася на 1 %. Але характэрны іншы момант.

Сярод раёнаў горада часцей назіралася зніжэнне колькасці кватэр на продаж, аднак у двух з іх колькасць прапаноў прыкметна вырасла — у Цэнтральным і Кастрычніцкім. Гэта звязана з выгрузкай у базу аб'яў аб продажы новабудоўляў некаторымі сталічнымі агенцтвамі. Такім чынам, у агульнай базе кватэр Мінска крыху больш за 16 тысяч жыллёвых аб'ектаў.

Разглядаючы аналітычную базу даных, варта заўважыць, што за месяц аднапакаёвыя кватэры патаннелі на 0,5 % (за год — мінус 13,5 %), а двухпакаёвыя за гэты час нават злёгку падаражэлі на 0,7 % (за год — мінус 8,2 %). «Аселі» за месяц і трохпакаёвыя кватэры.

### СПЕЦЫЯЛІСТЫ ЧАКАЮЦЬ ПЕРАДНАВАГОДНЯЙ АКТЫЎНАСЦІ, А ПОТЫМ — «МЁРТВЫ СЕЗОН»

На рынку нерухомасці мяне заўсёды больш цікавіла не што было, а што будзе. Мікалай Прасталупаў амаль на 100 % упэўнены, што і сёлета будзе назірацца перадначагодні ажыятаж.

Гэта калі людзі вераць, што абавязкова будзе табе шчасце, калі атрымаеш ключы ад новай кватэры ў старым годзе. Ёсць такое павер'е. Таму, нягледзячы на ўсякія там вірусы, людзі будуць актыўна купляць жыллё ў лістападзе і да сярэдзіны снежня. Пачынаючы з трэцяй дэкады апошняга месяца года, аглядаць кватэры ўжо ніхто не будзе. Святочны адпачынак спецыялісты па нерухомасці разлічваюць канчаткова адгуляць у сярэдзіне студзеня. Да гэтага часу кватэры наўрад ці паспеюць патаннець больш чым на адзін працэнт.

Не бачыць прасвету на рынку нерухомасці наш эксперт нават да вясны. Па яго прагнозах, да сакавіка месяца на рынку будзе назірацца слабабягучае патанненне, тэмпам не больш чым 0,5 % у месяц. І гэта пры тым, што сабекошт будаўнічых матэрыялаў у свеце толькі даражэе. Справа ў тым, што ў Мінску ўжо назбіралася дастатковая колькасць пустога жылля, а патэнцыйныя пакупнікі не асабліва спяшаюцца купляць яго. А можа, проста ў людзей няма грошай? Сітуацыю магла б выправіць спецыяльная праграма крэдытавання з невялікімі працэнтамі. Але падчас разнастайных санкцый з боку Захаду на гэта разлічваць не даводзіцца.

### АСВАЕННЕ ФАНІПАЛЯ НЕ ЗА ГАРАМІ

У Мінску ў чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, яшчэ застаецца крыху больш за 188 тысяч грамадзян. Гэта трэць ад агульнай колькасці чаргавікоў у краіне. **Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алена ЛУКАШЭВІЧ** кажа, што больш за ўсё маюць патрэбу ў Заводскім, Маскоўскім і Фрунзенскім раёнах. Менш за ўсё — крыху больш за 8 тысяч — у Цэнтральным.

— Ужо заселены два дамы ў Смалявічах. Другі дом, які складаецца са 192 кватэр, набраў больш за 800 ахвотных. Квадратны метр там тады каштаваў 1200 рублёў, — адзначыла эксперт.

Каб вызначыць, хто стане яго навасельцам, кіраваліся датай пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У выніку жыллё дасталося тым, хто даўжэй знаходзіўся ў чарзе. На дадзены момант сфарміраваны і будуюцца яшчэ тры дамы ў спадарожніку. Акрамя іх, трэба будзе ўзвесці шэсць шматпавярховікаў для чаргавікоў. Услед за Смалявічамі хутка пачнецца асваенне яшчэ аднаго спадарожніка — Фаніпаля.

### ПЕРЫФЕРЫЯ — НА СВАЁЙ АСАБЛІВАЙ ХВАЛІ

У адрозненне ад Мінска, дзе ў параўнанні з другім кварталам колькасць прададзеных кватэр знізілася, у абласных цэнтрах колькасць здзелак, наадварот, павялічылася. У выніку сумарны попыт у трэцім квартале 2021 года стаў адным з максімальных для гэтых месяцаў за апошнія дзесяцігоддзе ва ўсіх рэгіянальных цэнтрах.

У буйных гарадах краіны попыт вырас яшчэ больш істотна: у большасці з іх колькасць здзелак у параўнанні з актыўным другім кварталам вырасла на 15—30 %. Як вынік, у некаторых гарадах адзначаўся новы максімум здзелак за ўсю гісторыю назіранняў (у Барысаве, Баранавічах, Полацку), у іншых узровень продажаў вярнуўся да высокіх значэнняў дакрызіснага 2019 года.

### ЯКІЯ КВАТЭРЫ (АКРАМЯ МІНСКА) ВЫБІРАЛІ Ў ТРЭЦІМ КВАРТАЛЕ?

Найбольшым попытам у жыхароў краіны карысталіся двухпакаёвыя кватэры — з імі ў большасці гарадоў заключылі ад 40 % усіх здзелак. Максімальная доля такіх кватэр была ў Салігорску, Гродне і Бабруйску — тут кожная другая прададзеная кватэра была двухпакаёвая.

Крыху радзей набывалі аднапакаёвыя кватэры — звычайна ў 35—38 % выпадкаў. Традыцыйна найбольш нізкая іх доля ў агульным попыце была ў Гродне і Лідзе (па 24 %), а найбольш высокая ў трэцім квартале — у Маладзечне і Полацку (па 42 %).

Трохпакаёвыя кватэры ў большасці гарадоў займалі менш чым 20 % ад усіх здзелак. У некаторых гарадах іх удзельная вага і зусім не перавышала 16 %. Напрыклад, у Полацку, Віцебску і Маладзечне. У Гродне і Лідзе, наадварот, трохпакаёвай была кожная трэцяя з усіх прададзеных кватэр.

Асноўная маса прададзеных кватэр у буйных гарадах рэгіёна размяшчалася ў дамах 1971—1990 гадоў пабудовы, крыху радзей выбіралі кватэры ў дамах яшчэ больш старых — ад 1950 да 1971 года пабудовы. Кватэры ў новых дамах (пабудаваных пасля 2010 года) традыцыйна часцей фігуравалі ў здзелках у Брэсце і Гродне, а таксама ў Барысаве.

### НЕ ХАПАЕ ЖЫЛЛЯ Ў РЭГІЁНАХ, ТАМУ ЯНО І ДАРАЖЭЕ

Па рэгіянальных гарадах краіны ў нас ёсць інфармацыя толькі за трэці квартал. Дык вось, за гэты час цэны квадратнага метра выраслі ў 12 з 17 буйных гарадоў краіны.

У адрозненне ад сталіцы, дзе за квартал цэны паказалі невялікае зніжэнне, у рэгіёнах дынаміка была куды больш істотная. Сярод абласных цэнтраў асабліва вылучаліся Брэст і Магілёў, дзе за тры месяцы квадратны метр дадаў 4 % і 5 % адпаведна. У Віцебску і Гомелі цэны на кватэры выраслі ў сярэднім на 2—3 %. І толькі ў Гродне дынаміка была адмоўная: -1 % у параўнанні з летнім перыядам.

Сярод буйных гарадоў максімальны рост сярэдніх цэн квадратнага метра адзначаўся ў Оршы (+10 % да мінулага квартала) і Лідзе (+9 %), крыху менш (5—6 %) — у Мазыры, Полацку і Барысаве. Адмоўнай дынаміка была толькі ў трох рэгіянальных гарадах: Наваполацку, Салігорску і Пінску. Тут «квадрат» стаў таннейшы на 3 %.

Не выклікае сумненняў той факт, што ад сезона залежаць ваганні на рынку нерухомасці, бо вялікая колькасць свят, відавочна, не спрыяе вялікай колькасці продажаў. Безумоўна, калі на рынку з'яўляюцца вельмі прывабныя па кошце і якасці кватэры, то іх прададуць хутка ў любы час года. Але часцей бывае так, што купля кватэры моцна залежыць ад таго, у які час года яна адбываецца.

Лічыцца, што снежань — перыяд актыўных продажаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Перадсвяточнае

# ЧАКАЦЬ УЖО НЯДОЎГА — ХУТКА БУДЗЕ ЁЛКА

**Да навагодніх свят Мінск упрыгожаць калляднымі вянкамі, тэматычным пано з адзінаццаціпавярховы будынак, кампазіцыямі пернікавых домікаў, светлавымі фігурамі ў выглядзе птушак і звяроў.**

Мінск па-асабліваму рыхтуецца да сустрэчы Новага года. Гараджане любяць гэтае свята. На вуліцах развешваюць упрыгажэнні, у крамах — навагоднія прысмакі, плошчы заліваюцца агнямі. Ярка выглядаюць і старыя цэнтральныя раёны, і сучасныя кварталы. Прыгожа зззяе зімой будынак Нацыянальнай бібліятэкі.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінскрэклама», сёлета да навагодніх і калядных свят, як і ў папярэднія гады, распрацавана канцэпцыя ўнікальнага афармлення Мінска. У кожнай лакацыі будзе свая прасторава-мастацкая кампазіцыя, з'явіцца шмат новых аб'ёмных светлавых канструкцый і тэматычных фотазон. Прыгожым элементам таксама стане ўпрыгожванне мачтаў асвятлення на цэнтральных праспектах — на іх размесцяць калядныя вянкі. У некаторых раёнах сталіцы ўжо пачалі ўстанаўліваць навагоднія ёлкі, фотазоны і святочную ілюмінацыю. Асноўныя работы па ўпрыгожванні Мінска плануюць завяршыць да 15 снежня.

Стала вядома, што ўпрыгожваць сталіцу будуць 33 ёлкі. Традыцыйна асноўным месцам сустрэчы свята ў Мінску стане Кастрычніцкая плошча. У цэнтры ўстановяць 20-метровую ёлку, падсвечаную мільёнамі агнёў, скульптуры казачных персанажаў і гіганцкія шары, на фоне якіх зможа сфатаграфавацца любы ахвотны. Ёлка будзе дэкарыраваная россыпам рознакаляровых шароў, фрэзераванымі сняжынкамі, званочкамі і эфектнай піксельнай сеткай, якая стварае дзясяткі разнастайных малюнкаў.

Па-новаму аформяць тэрыторыю. Гэтым разам на пляцоўцы побач з ёлкай усталююць аб'ёмныя светлавыя канструкцыі з 28 ажурных фантанаў, кожны з якіх вышынёй тры метры. Дзякуючы дынамічнай падсветцы будзе ствараца ілюзія струменістай вады. У ноч на 1 студзеня гасцей і жыхароў сталіцы будзе чакаць забаўляльная праграма, якая ўключае дыскатэку, працяглы салют, выступленне мясцовых артыстаў, конкурсы ад шоўменаў, Дзеда Мароза і Снягуркі, навагодняе віншаванне Прэзідэнта.

Увагу на мерапрыемства абсалютна бясплатны, аднак не варта забываць, што ў Мінску публічнае распіццё спіртных напояў забаронена. У выпадку парушэння грамадскага парадку міліцыя выведзе з плошчы грамадзян, якія перабралі сваю норму, і наўрад ці яны абыдуцца вусным папярэджаннем.



Ужо некалькіх гадоў на Кастрычніцкай плошчы залівалі каток, непадалёк ад якога размяшчаўся пункт пракату канькоў. Апошнім часам зімы ў Беларусі выдаюцца цёплыя, а сярэдняя тэмпература ў пачатку студзеня знаходзіцца на адзнацы 0 °С. Як вынік, лёд з'яўляецца на плошчы толькі ў тым выпадку, калі навагоднія святы ўжо мінулі. Аматарам пракаціцца на каньках напярэдадні 1 студзеня можна схадзіць у Палац спорту на Нямізе, «Мінск-Арэну» або «Чыжоўка-Арэну».

Ёлку на плошчы Незалежнасці ўпрыгожаць вялікай колькасцю цацак у бардова-залатых колерах. Яе вышыня — 18 метраў. Побач установяць дэкаратыўныя лічбы «2022» вышынёй 2,5 метра. Кампазіцыя будзе гарманічна перагукацца з бардова-зялёным пано з ажурным малюнкам зімовай намаразі, якое размесцяць на фасадзе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. Яго вышыня — 40 метраў, што адпавядае адзінаццаціпавярховаму будынку. Асаблівасці мантажу пано дазваляюць тэматычнаму малюнку выглядаць рухома.

Вакол шклянога купала ГЦ «Сталіца» ўстановяць светлавую кампазіцыю ў выглядзе кароны. Яе ўпрыгожаць яловымі галінкамі і яркімі навагоднімі шарамі. З боку гасцініцы «Мінск» размесціцца аб'ёмная стылізаваная канструкцыя мяшка Дзеда Мароза, аздобленая мяккім матэрыялам і мехам. Яе вышыня — 4 метры.

Каля Палаца спорту на праспекце Пераможцаў разам з ёлкай, упрыгожанай у сярэбрана-фіялетавых тонах, з'явіцца кампазіцыя з трохметровых пернікавых домікаў. Тут таксама ўстановяць ажурную чатырнаццаціметровую свечку, на яе трохах будуць замацаваныя бліскучыя фрэзераваныя сняжынкі. Іх святочны і казачны выгляд забяспечыць падсвятленне. Уздоўж набярэжнай Свіслачы з'явяцца светлавыя фігуры задыякальных жывёл.

На плошчы Дзяржаўнага сцяга размесціцца ёлка ў нацыянальных колерах. Яе ўпрыгожаць чырвонымі, зялёнымі і сярэбранымі цацкамі, побач паставяць светлавыя кампазіцыі ў навагодняй тэматыцы.

Паблізу Ратушы з'явіцца кампазіцыя з фрэзераваных вытанчаных ёлак вышынёй 10, 12 і 14 метраў, якія будуць падсвечаны рознымі кветкамі. Да калон аб'екта прымацуюць светлавыя лічбы надыходзячага года — 2022. Побач з Беларускім дзяржаўным цыркам акрамя ёлкі ўсталююць дзве аб'ёмныя фігуры мультяшных тыгранят у асяроддзі навагодніх цацак і падарункаў. А каля Камароўскага рынку з'явіцца светлавая аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя з прыбранымі снегірамі.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ БУТЭЛЬКІ

### «Я НЕ МАГЛА СПАКОЙНА ГЛЯДЗЕЦЬ НА ГЭТЫ «ДЫВАН»

Усё пачалося са звычайных прагулак з каляскай адной шматдзетнай мамы. У мастачкі Дар'і Чыбуевай, якая 6 гадоў таму разам з сям'ёй пераехала жыць у Новае Поле з Мінска, трое маленькіх дзетак. Старэйшых з іх яна водзіць у садок.

— Штодзень мой шлях пралягае каля закінутага пустыра, — распавядае Дар'я. — Там, літаральна побач з дарогай — каля падмурка, які застаўся ад пабудовы часоў князёў Друцкіх-Любецкіх, — адпачываюць, у прамым сэнсе не адыходзячы ад касы (тут жа месціцца і мясцовая крама. — **Аўт.**), аматары спіртных напояў. Такое сабе імправізаванае кафэ на прыродзе.

Год таму там усё было ўсцелена бутэлькамі. Калі б цэлымі — яшчэ не так страшна. Але ж іх пастаянна разбіваюць.

— Ідзеш з дзецьмі, а з зямлі тырчаць асколкі вострымі краямі ўверх, гэткія «ружачкі», — працягвае мая суразмоўца. — У мяне, напрыклад, сабака ледзь не загінуў пасля таго, як парэзаў лапу аб шкло. А дзеці там пастаянна бегаюць. Дзе гарантыя, што хтосьці з іх не спатыкнецца і не параніцца?

Дар'я не магла спакойна глядзець на гэты «дыван» з бутэлек. Таму, перад тым як выйсці з дому, клала ў каляску пакет і пальчаткі, каб своечасова, пакуль хто-небудзь не разбіў, прыбраць бутэлькі з дарогі. Прыбраць прыбрала, а што рабіць з імі далей? Калі выкінуць у агульны кантэйнер для смецця, дык яны апынуцца на звалцы. А гэта азначае — проста перакласці іх з аднаго месца на другое.

Таму Дар'я вырашыла абзванічаць арганізацыі, якія збіраюць шкло для далейшай перапрацоўкі. «Так, мы з задавальненнем вывезем вашы бутэлькі, — пагадзілася дзяржпрадпрыемства «ЭкаСпецТранс». — Але ёсць адзін нюанс: каб машына прыехала ў вашу вёску, трэба сабраць 100 кілаграмаў».

### «ЗРАЗУМЕЛА, ШТО АДНА 100 КІЛАГРАМАЎ НЕ НАЗБІРАЮ»

— Я ніколі ў жыцці не здавала бутэлькі, — усміхаецца Дар'я, — таму нават прыблізна не ўяўляла, колькі гэта мяшкоў. Наіўная, цэлы месяц хадзіла і збірала шкло. У выніку зразумела, што адна 100 кілаграмаў не адолею.

У Новым Полі ёсць агульнавясковы чат. Маладая маці напісала туды і папрасіла дапамагчы ёй сабраць бутэлькі, хто колькі зможа. І людзі адгукнуліся. Цэлымі сем'ямі збіралі шкло ўздоўж сваіх вуліц, у мясцовым лесе...

— Вельмі кранальна, што аднавяскоўцы не кінулі мяне сам-насам з праблемай, падтрымалі ідэю, — прызналася Дар'я. — Ужо праз тыдзень на маім участку вырасла вялізная гара шкла. Калі прыехалі нарыхтоўшчыкі і ўзважылі — атрымалася 220 кілаграмаў. Мы перавысілі норму ў два разы. Машына з'ехала, а я стаю і разумею... што свой мяшок, які назбірала дома, аддаць забылася. «Так, народ, — кажу, — гэта лёс: трэба збіраць яшчэ». *(Смяецца.)* Другі раз мы ўжо здалі больш за паўтоны шкла.

Аказалася, што ў Новым Полі тых, хто, як і Дар'я Чыбуева, перажывае за экалогію, шмат. Многія не першы год сартуюць смецце і адвозяць пластык у Мінск — у кантэйнеры для раздзельнага збору.

— Натхнёўшыся першым поспехам, мы вырашылі паспрабаваць здаць «ЭкаСпецТрансу» яшчэ і пластык, — распавядае Дар'я Чыбуева. — Апошні, у адрозненне ад шкла, вельмі лёгкі, таму ніхто не верыў, што зможам назбіраць 100 кілаграмаў ПЭТ-бутэлек. Тым не менш мы зладзілі суботнік. Пайшлі ў лес і назбіралі 25 вялікіх мяшкоў пластыку. З намі была старшыня Гаранскага сельвыканкама Вольга Антоненка, якая падтрымлівае нас у гэтай справе. І, што вы думаеце, усе мяшкі некуды зніклі. Хто і куды вывез наш пластык, дагэтуль не ведаем.

Але навапольцы, да якіх яшчэ далучыліся жыхары суседніх вёсак Казельшчыны і Чаромухі, усё адно не спыніліся. Працягнулі збіраць другасныя рэсурсы. Першы раз здалі недзе 60 кілаграмаў. Другі — больш за 100. Нарыхтоўшчыкі не паверылі сваім вачам. У «ЭкаСпецТранс» не думалі, што фізічныя асобы могуць сабраць столькі пластыку.

### «МАРЫМ ПРА ГРАМАДСКУЮ САРТАВАЛЬНУЮ СТАНЦЫЮ»

Зараз у Новым Полі і наваколлі каля 30 сем'яў, якія актыўна сартуюць і здаюць пластык і шкло.


Другасную сыравіну забірае спецыяльная машына.

— Ладзім спаборніцтвы паміж вуліцамі: хто збярэ больш, — распавядае Дар'я. — Нас аб'ядноўвае тое, што ўсе мы хочам жыць не толькі ў бяспецы, але і ў чысціні, прыгажосці, утульнасці. З кожным днём больш і больш людзей даведваецца пра нашу ініцыятыву. Шчыра радуемся кожнаму новаму чалавеку, які далучаецца да вясковай экалагічнай супольнасці. Вёска ў нас вялікая: разам са студэнтамі — недзе паўтары тысячы жыхароў. Прыемна, што нават тыя, хто пакуль не сартуе смецце, ухваляюць наш лад жыцця, з гонарам кажуць кіраўніцтву раёна: «Яны такія малайцы ў нас! Здаюць шкло і пластык на перапрацоўку, а потым святы ладзяць за гэтыя грошы».

Вядома, вяскоўцы здаюць бутэлькі не дзеля грошай (кілаграм каштуе капейкі). Разам з тым, прызнаецца Дар'я, прыемна, што гэта не бясплатна.

— Раз здалі — атрымалі 19 рублёў, другі, трэці — па 50, і вось у нас ужо ёсць магчымасць правесці свята ў вёсцы. Так, увесну ладзілі рэтра-кірмаш, закуплялі прадукты, з якіх гаспадыньці гатавалі розную смакату. На грошы са здачы другаснай сыравіны зараз робім аддзелку ў доміку творчасці, які пабудавалі самі.

Дар'я Чыбуева, якую жыхары выбралі старастай вёскі, радуецца, што зараз на вясковых вуліцах стала ў разы менш бутэлек.

— Я цяпер прынцыпова слова «смецце» датычна шкла і пластыку не ўжываю. Гэта наш каштоўны рэсурс, другасная сыравіна. Шторaз, калі гляджу на яе і разумею, што ўсё гэта пойдзе на перапрацоўку, душа радуецца.

— Дар'я, а вы не думалі паставіць у вёсцы кантэйнеры для раздзельнага збору смецця? — пытаюся.

— Раней думалі. Але цяпер марым пра большае. Хочам зрабіць сартавальную станцыю. Гэта павінна быць сучаснае памяшканне, куды можна прыйсці і адсартаваць другасныя рэсурсы. Там будзе шмат кантэйнераў не толькі для шкла і пластыку, але і для батарэек, лямпачак, каляровых металаў. Гэта абавязкова павінна быць закрытае памяшканне, каб ніхто не мог нічога скрасці ці зрабіць там склад непатрэбных рэчаў. За ўзор бралі грамадскія пляцоўкі скандынаўскіх краін. Там у кожнай вёсцы ёсць дамкі, дзе мясцовыя жыхары сартуюць рэсурсы. Ва Украіне такія станцыі з'яўляюцца культурнымі аб'ектамі. У іх там і кафэ, і крама, дзе прадаюць вырабы з другаснай сыравіны. Мы ўжо нават месца знайшлі і пачалі збіраць грошы, каб пабудаваць такую пляцоўку. Але ўзняліся цэны на будаўнічыя матэрыялы... Таму пакуль адклалі гэтую тэму. Хочам таксама паставіць у найбольш праблемных месцах сметніцы для пластыку і шкла. Людзям, якія адпачываюць на прыродзе, упэўнена, не будзе складана кінуць туды бутэльку.

У планах жыхароў Новага Поля і будаўніцтва грамадскага кампостара. Бо не сакрэт: чым менш арганічных адходаў трапляе на агульную звалку, тым лепш для экалогіі.

— У вёсцы кампост — на вагу золата, — усміхаецца Дар'я. — Гэта — цудоўнае ўгнаенне. Праўда, не ўсе — асабліва моладзь, якая перасялілася з горада, — разумеюць, што гэта і навошта. У іх уяўленні кампосная яма асацыіруецца са смуродам. Але ж ёсць спецыяльныя бактэрыі, якія можна туды дадаваць, каб не было дрэннага паху. Спадзяюся, што на лета ў нас з'явіцца грамадскі кампостар, куды заселім каліфарнійскіх дажджавых чарвякоў. Я ўжо даведалася, дзе іх можна ўзяць.

Напрыканцы размовы староста вёскі Новае Поле працытавала японскага паэта Кабаясі Іса.

— «Ціха, ціха паўзі, // Слімак, па схілу Фудзі // Уверх, да самых вышыняў!» Слімак — адзін з сімвалаў нашай вёскі. Іх тут шмат яшчэ з часоў князёў Друцкіх-Любецкіх, якія трымалі цэлую ферму вінаградных малюскаў. Калі глядзіш на слімака, здаецца, што ён зусім не рухаецца, але праз нейкі час ты паварочваешся, а яго ўжо няма. Дык вось і мы, як тыя слімакі, ідзём да мэты павольна, у сваім тэмпе. Але самае галоўнае, што рухаемся ўверх. Мы яшчэ толькі год здаём шкло, пластык і макулатуру — а ўжо колькі ўсяго цікавага адбылося. У Новым Полі пытанні не толькі з сарціроўкай другасных рэсурсаў. І іншых праблем хапае. Вырашыць за секунду іх немагчыма, але калі рабіць пакрысе, то і не заўважыш, як жыццё ў вёсцы зменіцца да лепшага.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**

*Мінскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ПАРАДЫ ТЫМ, КАГО НАТХНІЎ ДОСВЕД ЖЫХАРОЎ НОВАГА ПОЛЯ

**Парада 1.** Знайдзіце арганізацыю, якая ў вашым раёне возіць шкло і пластык на перапрацоўку. Даведайцеся, колькі кілаграмаў другаснай сыравіны патрэбна, каб прыехала машына. І пачынайце збіраць.

**Парада 2.** Пачынайце са шкла. 100 кілаграмаў шкляных бутэлек назбіраць прасцей, чым 100 кілаграмаў пластыкавых.

**Парада 3.** Калі хочаце знайсці аднадумцаў, то проста прайдзіцеся па суседзях. Паверце, многім з іх будзе няцяжка складаць пластык і шкло асобна, а не кідаць у сметніцу. Тым больш бутэлькі ж мыць не трэба. «На самым пачатку распавядаць пра экалогію і высокія матэрыі не варта, — раіць староста вёскі Новае Поле. — Лепш проста папрасіць дапамогі. У нас людзі вельмі спагадлівыя, чулыя. Прынамсі, тыя, што мяне акаляюць, такія».

**Парада 4.** Калі побач ёсць аграсядзіба ці прыдарожная кавярня, можна скааперавацца з імі. Разам заўсёды назбіраеце неабходную колькасць шкла і пластыку.

Жывіце ў бяспецы

# АПЕРАТЫЎНЫ АДКАЗ НА ЗДАРЭННІ

## Службы і арганізацыі рэагуюць на шматлікія надзвычайныя сітуацыі ў рэжыме рэальнага часу

**Вучэнне па адпрацоўцы плана абароны насельніцтва і тэрыторый ад здарэнняў прыроднага і тэхнагеннага характару ў Барысаўскім раёне пачалося з ліквідацыі наступстваў умоўнага снегападу.**



Па легендзе, у аграгарадку Неманіца адбыўся падмыў плаціны і яе частковае разбурэнне. Дапамога спатрэбілася і рыбаку, які перакуліўся з лодкі. 30 домаўладанняў у вёсцы Вуглы аказаліся затопленыя. Надзвычайная сітуацыя адбылася з-за багатага выпадзення мокрага снегу. Супрацоўнікі Таварыства ратавання на водах не далі рыбаку патануць. Мужчыну даставілі на бераг і з прыкметамі пераахаладжэння перадалі медыкам.

Для аператыўнага аказання дапамогі людзям, якія пацярпелі з-за разбурэння дамбы, адбылося выязное пасяджэнне раённай камісіі па надзвычайнай сітуацыі, у ходзе якой былі вызначаны службы, неабходныя для аператыўнага рэагавання на сітуацыю і іх канкрэтныя дзеянні. Аб здарэнні ратавальнікі і супрацоўнікі міліцыі аператыўна апавясцілі мясцовае насельніцтва. Ажыццяўляўся абход жыхароў вёскі для арганізацыі іх адсялення ў пункт часовага знаходжання.

Тым часам дарожнікі пры дапамозе пяску ліквідавалі пранікненне вады ў меліярацыйны канал, з якога, каб мінімізаваць падтапленне жылых дамоў, ратавальнікі аператыўна адпампавалі ваду. Адпаведнымі службамі быў адрэгуляваны ўзровень вады, адбылося даследаванне яе якасці, для мясцовых жыхароў арганізавалі падвоз пітной вады.

— Сёння сіл і сродкаў для рэагавання на надзвычайныя і іншыя пазаштатныя сітуацыі дастаткова, — адзначыў **першы намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Уладзімір ЯНЧЫК**. — Галоўнае — у выпадку рэальнай надзвычайнай сітуацыі прыняць правільныя кіраўнічыя рашэнні, скаардынаваць і наладзіць выразнае ўзаемадзеянне ўсіх органаў і службаў. Вучэнні, якія праходзяць на тэрыторыі раёна, пакажуць, наколькі наладжана гэтае ўзаемадзеянне ў рэгіёне.

Паводле легенды іншага этапу вучэння, каля вёскі Ланкаўшчына ў выніку праходжання цыклону ўтварыліся снежныя сумёты, пападалі дрэвы. З-за гэтага адбылося дарожна-транспартнае здарэнне: сутыкнуліся легкавы аўтамабіль і экскурсійны аўтобус. Пацярпелі тры чалавекі. Затор, які ўтварыўся ў выніку аварыі, прывёў да поўнага спынення аўтатранспрату ў абодвух кірунках. А, між іншым, па задумцы арганізатараў, на вуліцы — 20 градусаў марозу.

Падраздзяленні МНС, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, дэблакіравалі кіроўцу легкавога аўтамабіля і эвакуіравалі пасажыраў аўтобуса. Пацярпелыя былі перададзены медыкам, астатнія грэліся ў разгорнутым пункце Чырвонага Крыжа. Супрацоўнікі лясгаса распілілі дрэвы, якія ўпалі, і вызвалілі праезную частку. Міліцыянеры ачапілі месца здарэння і забяспечылі бяспечнае праводзенне работ па ліквідацыі наступстваў непагадзі.

Акрамя таго, у межах вучэння была адпрацавана ліквідацыя наступстваў пашкоджання падземнага газаправода высокага ціску. У той жа дзень спецыялісты спраўляліся з аварыйным адключэннем у сістэме цеплазабеспячэння.

— Сітуацыі, якія адпрацоўваюцца ў гэтыя дні, цалкам магчымыя ў рэальным жыцці, — заўважыў **намеснік старшыні Барысаўскага райвыканкама Дзмітрый МАКСІМЕНКА**. — Напярэдзе зіма, і ўсе аб'екты жыццезабеспячэння павінны функцыянаваць беспераболійна. А калі пэўныя няштатныя сітуацыі і адбудуцца, то службы павінны аператыўна на іх рэагаваць.

**Вераніка КАНЮТА,**

*Барысаўскі раён.*

У цэнтры ўвагі

# «НА ГЭТУ ТЭМУ ЦЯЖКА ГАВАРЫЦЬ, але яе нельга замоўчваць»

## Якія меры прымаюцца для прафілактыкі гвалту над непаўналетнімі

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА прыняў удзел у пасяджэнні камісіі па справах непаўналетніх. Перад пасяджэннем ён расказаў журналістам, што ў Беларусі паніזіўся ўзровень злачыннасці сярод непаўналетніх.**

«Тэндэнцыі апошніх 9 месяцаў сведчаць, што зніжаецца ўзровень злачыннасці сярод непаўналетніх, гэтая лічба складае 11,2 %. Гэта нармальная тэндэнцыя, яна гаворыць аб эфектыўнасці комплексу мер, якія прымаем мы і суб'екты прафілактыкі. МУС, Міністэрства адукацыі і шэраг іншых органаў, сярод якіх праваахоўныя органы і органы пракуратуры, таксама адыгрываюць актыўную ролю ў прафілактычнай рабоце, каб зберагчы непаўналетніх ад учынення правапарушэння», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Аднак пакуль непаўналетніх злачынцаў становіцца менш, расце колькасць непаўналетніх ахвяр. На адмысловай прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры спецыялісты абмеркавалі меры, якія прымаюцца па прафілактыцы і супрацьдзеянні злачынствам супраць палавой свабоды і недатыкальнасці непаўналетніх. Як адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Віталь КАПІЛЕВІЧ**, у гэтай сферы назіраецца сумная тэндэнцыя росту.

«За дзевяць месяцаў гэтага года колькасць дзяцей, якія пацярпелі ад сексуальнага гвалту, узрасла на 52 працэнты, ад 354 да 540, пры гэтым практычна ў палове выпадкаў пацярпелыя — малалетнія — 48,3 працэнта. Пачынаючы з 2012 года выяўлена 4333 злачынствы па гэтым кірунку. Дзейнасць органаў унутраных спраў па выяўленні актаў педафіліі патрабуе дадатковых мер, накіраваных на прафілактыку і недапушчэнне супрацьпраўных дзеянняў», — расказаў Віталь Капілевіч.

Паводле слоў спецыяліста, на карысць злачынцаў працуюць інтэрнэт і сучасныя тэхналогіі: «Самае небяспечнае пры гэтым не фізічнае ўздзеянне, а псіхалагічны фактар і ўздзеянне дзіцяці ў залежнасць. І калі гэта становіцца здабыткам супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, мы маем вялікую колькасць ахвяр і зламаных лёсаў».

**Начальнік галоўнага ўпраўлення працэсуальнага кантролю Следчага камітэта Сяргей ЦІШУК** звярнуў увагу, што такімі справамі займаюцца асаблівыя следчыя, паколькі такія справы патрабуюць вялікай практычнай, тэарэтычнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі. Вядзецца работа і над псіхалагічным станам пацярпелага, бо насілле можа паўплываць і на яго далейшае жыццё. «Тыя, хто ўчыніў такія злачынствы, не спыняюцца на адным выпадку. Таму чым больш поўна будзе праведзена расследаванне і чым больш аб'ектыўна дадзена юрыдычная ацэнка, тым больш сур'ёзнае пакаранне атрымае асоба», — падкрэсліў Сяргей Цішук.

Важнае значэнне надаецца пытанню аб прычынах, якія садзейнічаюць злачынству. Высвятляецца, чаму дзеці пайшлі на кантакт, даследуюцца ўмовы жыцця. Не валодаючы пэўным жыццёвым вопытам, прадастаўленыя самім сабе, не маючы любові і клопату ад бацькоў, дзеці ідуць на кантакт з незнаёмымі людзьмі. «Рэкамендацыя ўсім бацькам — больш удзяляць увагі дзецям. Калі ў сям'і даверлівыя адносіны, у выпадку ўзнікнення незразумелай сітуацыі дзіця пойдзе і падзеліцца з бацькамі. І гэтую сітуацыю на ранняй стадыі можна будзе спыніць», — сказаў Сяргей Цішук.

Спецыялісты заклікаюць не замоўчваць інфармацыю пра гвалт над дзецьмі, а неадкладна паведамляць у праваахоўныя органы. Калі злачынца своечасова не прыцягнуць да адказнасці, могуць пацярпець іншыя дзеці, і маштабы гэтай злачыннай дзейнасці павялічацца.

«Падобная інфармацыя патрабуе большага давядзення, каб дзеці ведалі, як паводзіць сябе ў розных сітуацыях. Гэта датычыцца як наркотыкаў, так і палавога выхавання. Гэтую тэму нельга замоўчваць, каб людзі ведалі, як засцерагчы сябе і дзяцей», — падкрэсліў Сяргей Цішук.

Прафілактыкай злачынстваў супраць палавой свабоды непаўналетніх займаецца і Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь. «Па нашай ініцыятыве ўнесены змяненні ў закон аб аператыўна-пошукавай дзейнасці. Асноўная іх накіраванасць — удасканаленне парадку правядзення аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў у інтэрнэце, а таксама мерапрыемстваў, звязаных з даследаваннем тэхнічных прылад і камп'ютарнай інфармацыі. Рост злачынстваў супраць дзяцей звязаны з актыўным выкарыстаннем у сучасным жыцці інтэрнэту. Але сёння створаны такі нарматыўны інструментарый, які дае магчымасць максімальна эфектыўна выяўляць правапарушэнні ў гэтай сферы, забяспечваючы абарону правоў грамадзян. Таксама кожны год ажыццяўляюцца вывучэнне і праверка выканання заканадаўства аб прафілактыцы сямейнай неўладкаванасці, безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх. Заўсёды знаходзяцца праблемныя аспекты, у адказ на якія своечасова прымаюцца меры пракурорскага рэагавання», — расказаў **Сяргей ЗАМРО, начальнік упраўлення па наглядзе за аператыўна-пошукавай дзейнасцю і выкананні законаў у дзейнасці органаў дазнання Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь.**

### Клопат дома і ў школе

Прафілактыка падобных злачынстваў — гэта яшчэ і адказнасць адукацыйных устаноў. «Гвалт над дзецьмі ўяўляе сабой дастаткова сур'ёзную сацыяльную праблему. Стварэнне камфортнага асяроддзя вакол дзіцяці — гэта наша непасрэдная ступень адказнасці. Таму мы рэалізоўваем шэраг праектаў, накіраваных на стварэнне перш за ўсё бяспечнага і дружалюбнага асяроддзя ў сценах установы адукацыі, дзе дзіця, якое, магчыма, унутры сям'і падвяргаецца гвалту або зведвае знешні гвалт і не знаходзіць падтрымкі ў сям'і, можа атрымаць неабходную дапамогу», — расказала **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена ГАЛАЎНЁВА.**

На працягу шэрагу гадоў ідзе работа над змяненнем праграм падрыхтоўкі педагогаў-псіхолагаў з пэўным акцэнтам на арганізацыю прафілактыкі ва ўстановах адукацыі. Класным кіраўнікам, настаўнікам-прадметнікам нагадваюць: яны павінны ўмець бачыць і разумець, што дзіця адчувае стрэс, дыскамфорт, заўважаць нейкія складаныя моманты ў яго жыцці і спрабаваць аказаць дапамогу.

Паводле слоў Алены Галаўнёвай, прыярытэтная ўвага — рабоце з бацькамі. «У сістэме адукацыі рэалізоўваецца праект «Бацькоўскі ўніверсітэт», у рамках якога ідзе асветніцкая работа з бацькамі па пытаннях бяспекі дзяцей у інтэрнэце, прафілактыкі гвалту ў адносінах да дзяцей як у сценах установы адукацыі, так і ўнутры сям'і, на вуліцы, ад аднагодкаў. Мы праводзім дастаткова шырокую тлумачальную работу сярод бацькоўскай грамадскасці па ўзроставых асаблівасцях дзяцей, па фарміраванні ўзаемаадносін дарослых з дзецьмі, паміж дзецьмі. Безумоўна, аб'ектам галоўнай увагі прафілактыкі з'яўляецца само дзіця. Па ініцыятыве міністра адукацыі з верасня 2019 года на базе БДПУ імя Максіма Танка адкрыты Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі. І для таго каб кожнае дзіця сёння, хай ананімна, магло атрымаць такую дапамогу, у вучэбных дзённіках кожнага размешчаны QR-код гэтага цэнтра. І, паверце, дзеці тэлефануюць. У верасні на працягу тыдня мы атрымлівалі да 300 тэлефонных званкоў. Па QR-кодзе дзеці выходзяць на кантакт з псіхолагамі цэнтра, якія суправаджаюць іх ва ўсіх складаных сітуацыях», — падкрэсліла Алена Галаўнёва.

У гэты цэнтр могуць звяртацца і педагогі і паведамляць аб выяўленых фактах гвалту ў адносінах да дзяцей. Далей гэтую сітуацыю на кантроль возьмуць усе зацікаўленыя ведамствы.

Прафілактыка злачынстваў у адносінах да непаўналетніх знаходзіцца ў цэнтры ўвагі і парламентарыяў. Гэтае пытанне падымалі яшчэ дэпутаты Палаты прадстаўнікоў папярэдняга склікання. Перыядычна ў Палаце прадстаўнікоў праходзяць тэматычныя круглыя сталы. Пра гэта расказала **Марыя ВАСІЛЕВІЧ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.** «Наша самая галоўная задача — аператыўна рэагаваць на ўсе змены, навінкі ў тэхналогіях, лічбавай прасторы, якія могуць прывесці да гвалту над непаўналетнімі. І быць на крок наперадзе», — падкрэсліла дэпутат.

Па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў лістапад прысвечаны комплексным мерапрыемствам па гэтым кірунку. Спецыялісты заклікаюць усіх бацькоў быць уважлівымі да сваіх выхаванцаў. Калі ж бацькі не праяўляюць цікавасці да дзяцей, гэта можа рабіць нехта іншы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества Автотранспортного унитарного предприятия «Забудова-Автотранс»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Груз балансировочный 100 гр, 7 шт.; груз балансировочный 10 гр, 52 шт.; груз балансировочный 25 гр, 68 шт.; груз балансировочный 300 гр, 5 шт.; груз балансировочный 35 гр, 24 шт.; груз балансировочный 55 гр, 15 шт.; груз балансировочный 60 гр, 127 шт.; груз балансировочный 75 гр, 2 шт. | 34,37 | 3,44 | 1,72 |
| 2 | Автоэмаль белая 1 л, 3 шт.; краска серебристая 0,5 л; круг зачистной, 3 шт.; круг зачистной лепестковый,3 шт.; растворитель*уайт-спирит*, 5 шт.; эмаль серая 1,8 кг, 2 шт.; эмаль синяя 1,9 кг, 2 шт.; эмаль черная 0,9 кг/1,9 кг, 2 шт. | 43,32 | 4,33 | 2,17 |
| 3 | Антифриз 1/1л/для тормоз,системы, 0,30 л; масло 10в40*лотос*, 15,80 л; масло кс-19/компрессор/, 6 л; масло м10 дм, 30 л.; масло тэп-15/трансмиссионное, 20 л; А/лампа 12/21, 9 шт.; А/лампа 12/5, 9 шт.; А/лампа 24/1,2 б/цокальная, 11 шт.; А/лампа 24/21/3, 61 шт.; А/лампа 24/7570 галогеновая, 5 шт.; А/лампа 24н7, 2 шт.; А/шина 315/70R 22.5/востанов,б/у, 2 шт.; Акб 6ст-190, 2 шт.; болт карданный м 10, 47 шт.; болт карданный м12, 21 шт.; болт карданный м14, 4 шт.; болт м20 крепления короны, 9 шт.; болт наруж, диаметр мв м14, 2 шт.; болт штуцера обратки дв/ля 7511,1104433, 28 шт.; буфер 500а, 2 шт.; вилка делителя, 2 шт.; вилка кпп 1/2/3/передач, 2 шт.; вилка пс-325+розетка; вкладыш коренной .236/238., 2 шт.; вкладыш шатуный.236/238., 2 шт.; втулка 6430,3001029, 2 шт.; гайка стремянки, 19 шт.; гильза/поршень маз 236/238; датчик дкд-1/давления воздуха/; датчик дкд-2/давления масла/, 2 шт; датчик положения маз, 3502,3855; датчик тм-100, 2 шт.; датчик тм-111/сигнализатора/, 4 шт.; диафрагма 20/тормоз камер/, 2 шт.; диафрагма 201 кпп, 4 шт.; диафрагма 24/зад. перед.торм камер, 2 шт; диафрагма 30; диск/пятак/ контакт. ст-142, 8 шт.; захват передний.64221, 2 шт.; излучатель тепловой/эл. лампа 200вт, 4 шт.; клапан электромагнитный кэм-07, 6 шт.; коробка электрическа 4х рожковая, 2 шт; коробка электрическая 3х рожковая; кран вс-11.8101010 слива воды, 2 шт.; Кт вкладышей коренных 236/238; Кт прокладок головки блока ямз 236/238, 8 шт., Кт прокладок двигателя ямз 236/238, 2 шт. | 849,85 | 84,99 | 42,49 |
| 4 | Сверло 12/12.5, 2 шт.; сверло 18.0, 2 шт.; сверло 19.0, 3 шт.; сверло 22, 3 шт.; сверло 24; сверло 27; сменный шланг для шприца солид, 2 шт.; электроды 2,5 мм (2 кг), 3 шт.; электроды 3,0/5кг/2,5кг, 20 шт.; электроды 4мм, 19 шт. | 159,12 | 15,91 | 7,96 |
| 5 | Кабель аввг 2*2.5, 6 м; кран-клапан для закупорки бут. воды; круг отрезной, 12 шт.; крючок для полотенца, 13 шт.; лента для рулетки, 1 м; лента светоотражающая, 22,43 м; лента светоотражающая/сигнальная, 1 м; лента таможенная пвх, 247,50 м; метчик 24*1,5, 2 шт.; метчик м12, 5 шт.; метчик м20, 3 шт.; метчик м22, 3 шт.; миникомби В10/грибок/, 23 шт.; паста водочувствительная; пена монтажная, 6 шт.; плашка 20*1.5, 4 шт.; плашка 22*1.5, 4 шт.; плашка 24*1.5/2/, 4 шт.; плашка м12, 2 шт.; плашка м16, 3 шт.; провод пвс 2*0.75, 25 м; проволока сварочная, 3 м; развертка 25, 1 шт.; разъем внс, 8 шт.; резец расточной, 4 шт.; рукав раздаточный МБС 75 мм, 5 шт. | 807,14 | 80,71 | 40,36 |
| 6 | Жесткий диск 500гб | 11,88 | 1,19 | 0,59 |

В отношении вышеуказанных лотов проводятся первые торги

| | |
|---|---|
| **Местонахождение лотов** | **Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, д. 4** |
| **Дата и время проведения торгов** | **14 декабря 2021 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 12 ноября 2021 года до 16.00 10 декабря 2021 года** |

**Условия для участия в торгах**:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, УП «Забудова-Автотранс», проводимых 14.12.2021.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста составляет 7,5% (семь целых пять десятых процентов) от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться к Борису Юрьевичу +375 29 326-16-12.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Автотранспортное унитарное предприятие «Забудова-Автотранс» в лице ликвидатора – ООО «ФИБЛ» (Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4, УНП 600468334)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
12 лістапада 2021 г. № 44 (629)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ











Фота БелТА.

Наталля КАЧАНАВА:

# «МЫ ПАВІННЫ ПАСТАВІЦЬ ЗАСЛОНУ ХЛУСНІ, ЯКАЯ ЛЬЕЦЦА Ў АДРАС НАШАЙ КРАІНЫ»

## Круглы стол па пытаннях міграцыйнай сітуацыі на беларуска-польскай граніцы прайшоў у Савеце Рэспублікі

**СЁННЯ ў верхняй палаце парламента ў рэжыме відэаканферэнц-сувязі прайшло абмеркаванне адной з самых важных тэм для грамадства — міграцыйнага крызісу, які разгарнуўся на беларуска-польскай граніцы. Прадстаўніцы Беларускага саюза жанчын разважалі, чым можна дапамагчы бежанцам і як данесці да жыхароў калектыўнага Захаду праўдзівую інфармацыю аб тым, што адбываецца.**

Адзначыўшы вялікую колькасць на беларуска-польскай граніцы бежанцаў з краін Блізкага Усходу, якія імкнуцца трапіць у Еўрасаюз, спікер Савета Рэспублікі заўважыла:

— Гэта іх імкненне правамернае, таму што калісьці іх запрасілі для таго, каб яны прыехалі і маглі наладзіць там лепшае жыццё. Людзі едуць туды ад той рэальнасці, якая сёння ёсць у іх краінах, — і гэта іх права.

Яна нагадала, што некалькі гадоў таму ў Беларусі быў прыняты закон, які дазваляе людзям з 80 краін прыязджаць у нашу краіну без усялякіх перашкод:

— І мы, як гасцінныя людзі, заўсёды рады таму, каб да нас прыязджалі іншыя, — кажа яна. — Але тое, што адбываецца сёння на беларуска-польскай граніцы, не можа нас не хваляваць.

Яна падкрэсліла: цынічна і абуральна тое, як польскія ўлады спрабуюць абвінаваціць Беларусь у міграцкім крызісе. Такая пазіцыя, лічыць спікер верхняй палаты парламента, не паддаецца ніякаму лагічнаму тлумачэнню.

— Мы, жанчыны, бачым усю гэтую сітуацыю, калі людзі знаходзяцца без прытулку, на вуліцы. Гэта дзеці, цяжарныя жанчыны, пажылыя людзі. Думаю, кожны разважлівы чалавек сёння суперажывае ім, — перакананa яна.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала жалобныя старонкі гісторыі:

— Мы, жыхары Беларусі, не па чутках ведаем, што такое голад, холад і разруха. Нашы старэйшыя пакаленні перажылі ўсё гэта, і яно ў нашых сэрцах. І сёння гэта ў XXI стагоддзі адбываецца побач з нашай краінай, — выказала абурэнне яна. — Упэўненая, што жанчыны Беларусі на ўвесь голас заявяць аб недапушчальнасці падобнага абыходжання з людзьмі. Гэта антыгуманна, бесчалавечна. Гэта зневажанне ўсіх норм, міжнародных правілаў, якія дзейнічаюць у цывілізаваных краінах. Мы павінны паставіць заслону хлусні, якая льецца ў адрас нашай краіны і яе кіраўніцтва!

стар. 8

# ЗВАРОТ

## грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» у сувязі з сітуацыяй на граніцы

Мы, беларускія жанчыны, звяртаемся да ўсіх жанчын свету, жаночых і праваахоўных арганізацый, нацыянальных урадаў і да ўсіх тых, каму не абыякавая сітуацыя на беларуска-польскай граніцы. Вялікая колькасць грамадзян з краін Блізкага Усходу, якія імкнуцца ў Еўрасаюз, знаходзіцца ў міграцыйнай пастцы.

На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў калектыўны Захад навязваў блізкаўсходнім народам сваю дэмакратыю, пазіцыянуючы сябе як праваднікa «сапраўдных» каштоўнасцяў і «правільнага» ладу жыцця. Шчыра паверыўшы ў гэта, многія людзі пакінулі родную зямлю і ўсё, да чаго былі прывязаны душой і сэрцам.

Аднак на шляху да лепшага жыцця мігранты сутыкаюцца з суровай рэальнасцю. Не атрымліваючы згоды перасекчы польскую граніцу, людзі вымушаны суткамі жыць пад адкрытым небам, туліцца на сырой прамерзлай зямлі, паліць вогнішчы, каб сагрэцца. З-за холаду яны не могуць спаць ноччу, у іх няма запасаў пітной вады і ежы, адзення і абутку па надвор'і. Многія пачынаюць хварэць, маюць патрэбу ў медыкаментах і дапамозе спецыялістаў.

Пры гэтым мігранты не гатовыя вяртацца. Яны няспынна сцвярджаюць, што каля польскай граніцы застануцца да канца — нават калі ім наканавана загінуць.

Мы, беларускія жанчыны, не можам абыякава ставіцца да таго, што адбываецца, і заставацца безуважнымі. Бо мы — спадчынніцы тых, хто зведаў на сабе ўсе нягоды і пазбаўленні войн, развязаных не намі і не па нашай віне. З малаком маці нам перадалося пачуццё спачування да чалавечага болю і салідарнасці з тымі, хто трапіў у бяду. Нас глыбока раніць, што побач пакутуюць цяжарныя жанчыны, малалетнія дзеці, пажылыя, што людзі становяцца заложнікамі палітычных гульняў і маніпуляцый, не маючы магчымасці паўплываць на ўласны лёс.

Мы абураныя несправядлівасцю ў дачыненні да мігрантаў, чэрствасцю і бяздушнасцю заходніх палітыкаў. Для нас зусім незразумела, як можна заставацца ўбаку ад такіх абуральных выпадкаў парушэння правоў чалавека, прынцыпаў міжнароднага права, агульначалавечых каштоўнасцяў і нормаў паводзін.

Мы, жанчыны Беларусі, выступаем катэгарычна супраць нагнятання міграцыйнай сітуацыі каля граніц нашай міралюбівай краіны, супраць ілжывых абвінавачанняў у адрас Беларусі, нашых улад і нашага народа.

Мы заклікаем нацыянальныя ўрады краін Еўрасаюза спыніць уводзіць людзей у зман і выкарыстоўваць іх у сваіх палітычных мэтах. Выканайце абяцанні, якія былі дадзены, і стварыце ім умовы, прадугледжаныя ў падпісаных вамі міжнародных пагадненнях.

Жаночыя і праваахоўныя арганізацыі, журналісты, грамадзянская супольнасць і ўсе, каму не абыякавы лёс чалавецтва! Выяўляйце клопат аб мігрантах, заклікайце да адказнасці сваіх палітыкаў за ўзятыя абавязацельствы, да сумленнасці і прыстойнасці перад вамі, перад народамі і краінамі, перад усім светам!

# «МЫ ПАВІННЫ ПАСТАВІЦЬ ЗАСЛОНУ ХЛУСНІ, ЯКАЯ ЛЬЕЦЦА Ў АДРАС НАШАЙ КРАІНЫ»

## Гуманітарная катастрофа на граніцы

Сапраўдная сведка падзей, **старшыня першаснай арганізацыі БСЖ Савета Рэспублікі Тамара ЛЯВОНЧЫК**, як кажуць, з карабля на баль, прыехала на круглы стол з лагера бежанцаў. Яна вельмі эмацыянальна падзялілася ўражаннямі ад таго, што пабачыла за апошнія суткі:

— У лагеры каля трох тысяч чалавек. Паводле інфармацыі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, там знаходзіцца каля 500 дзяцей. Гэта самая ўразлівая катэгорыя асоб, якія шукаюць прытулак, — расказала яна.

Людзі прыйшлі туды без разліку затрымацца на такі працяглы час: без адпаведнага запасу ежы і адзення. Таму ў іх вельмі хутка скончылася вада і харчаванне. Ужо на другія суткі іх знаходжання на граніцы яны сталі востра адчуваць дэфіцыт пітной вады.

— Мы прыехалі туды з гуманітарным грузам першымі і прывезлі вялікую партыю пітной вады. Спачатку бежанцы арганізавана фарміравалі чаргу, але потым проста рынуліся лавінападобна. І гэта было дастаткова страшна. Мы адчулі, у якой ступені адчаю знаходзяцца людзі і зразумелі, наколькі сітуацыя сур'ёзная, які маштаб гэтай гуманітарнай катастрофы, — тлумачыць Тамара Лявончык.

Яна прыгадала, што БСЖ ужо аказваў дапамогу ў лагеры бежанцаў, які складаўся з 32 афганцаў, але там можна было аказаць дапамогу персанальна кожнаму, даведацца, каму і што патрэбна.

— Тут жа — вялікая колькасць людзей, і ўсе просяць папіць, штосьці паесці, а калі сцямнела — цёплых рэчаў і што-небудзь пасцяліць на халодную зямлю, — кажа яна.

На другія суткі знаходжання была раздадзена другая частка гуманітарнага грузу — у асноўным прадукты харчавання і вада, што так востра патрабуецца людзям.

— Раздавалі ў першую чаргу малым дзецям, таму што ў іх іншы менталітэт (яны не заўсёды аддаюць у першую чаргу ўсё дзецям і жанчынам), — адзначае лідар БСЖ Савета Рэспублікі.

Усяго за два дні было раздадзена сем з паловай тоны ежы. Але і гэтага недастаткова. Па словах супрацоўніцы Савета Рэспублікі, пітной вадой на сістэмнай аснове зараз забяспечвае Гродзенскі водаканал, але праблемы засталіся:

— Вельмі холадна: ноччу мінусавая тэмпература, прайшло два-тры дні — ва ўсіх разрадзіліся тэлефоны, яны не могуць ні з кім камунікаваць. Падвозіць харчаванне ім трэба кожны дзень. Мы прапаноўвалі вяртацца назад, яны адмаўляюцца: «Ні ў Гродна,



ні ў Мінск мы не хочам. І мы не хочам у Польшчу — мы хочам у Германію, Францыю», — прыводзіць словы бежанцаў Тамара Лявончык. — Колькі мы хадзілі па лагеры, цікавіліся, чым яшчэ можам дапамагчы, у адказ: «Калі нас прапусцяць праз граніцу?» Мы не можам ім адказаць на гэтае пытанне. Праблема патрабуе вельмі сур'ёзнага палітычнага рашэння.

## Класічныя дыпламатычныя метады

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** нагадала, што Арганізацыя Аб'яднаных Нацый аб'явіла 2021-ы — Міжнародным годам міру і даверу.

— Хто, як не мы, жанчыны, з адпаведнай нам міласэрнасцю і спачуваннем, можам звярнуцца да сусветнай супольнасці з тэмай вырашэння гуманітарнай катастрофы, якая адбываецца зараз на граніцы Беларусі і Польшчы, — кажа яна. — Хацелася б, каб Еўрасаюз, Варшава, афіцыйныя ўлады Польшчы пачулі наш голас, заклікі жанчын аб утаймаванні палітыкі, якая праводзіцца, і нарэшце пачалі працэс перагавораў. Звярнуцца да людзей з чалавечага пункту гледжання і па-чалавечы вырашыць гэты гуманітарны крызіс.

З сенатарам салідарная **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ**, якая лічыць, што вырашаць сітуацыю на беларуска-польскай граніцы трэба класічнымі дыпламатычнымі метадамі.

— Мы гатовыя сесці за стол перагавораў і размаўляць, але, на жаль, нашы калегі з замежных краін не хочуць ісці з намі на гэты дыялог, — расказала яна. — Таму мы, жанчыны, якія нясуць у сваіх руках дабро і свет, вырашылі сабрацца, абмеркаваць гэтую сітуацыю і вызначыць па-жаночаму варыянты яе вырашэння. Сёння вельмі важна далучаць міжнародныя гуманітарныя, прававыя аспекты. Важна кансалідавацца і аказаць элементарную дапамогу тым бежанцам: прадуктамі, цёплым адзеннем, вадой.

Беларускія жанчыны нераўнадушныя да гэтай сітуацыі і вераць, што іх пачуюць еўрапейскія калегі, спадзяюцца на вырашэнне канфліктнай сітуацыі.

## Задача — максімальна распаўсюдзіць інфармацыю

**Дырэктар прадстаўніцтва ТРК «МІР» у Беларусі Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** таксама выказала сваё меркаванне адносна крызіснай сітуацыі з мігрантамі:

— На дадзены момант мы бачым карціну поўнай дэгуманізацыі Еўропы: тыя, хто прапаведваў еўрапейскія каштоўнасці і ставіў жыццё чалавека (тым больш калі мы кажам аб дзецях, жанчынах) вышэй за ўсе каштоўнасці, сёння прымушаюць гэтых дзяцей і жанчын пакутаваць на граніцы ў літаральным сэнсе, — кажа яна і прыводзіць яскравы прыклад: — Кадры, калі дзіця просіць у польскіх пагранічнікаў вады, на мой погляд, каб журналісты працавалі на тэрыторыі граніцы па той бок, павінны былі разляцецца па ўсім свеце.

Аднак яна падкрэслівае: інфармацыйная прастора па той бок вельмі хутка закрываецца, і, на жаль, гэтага бесчалавечнага стаўлення не ўбачаць гледачы Еўрапейскага саюза:

— Гэта дасягальна толькі нам, і наша задача зрабіць так, каб сусветная супольнасць нас пачула, — падкрэслівае Вольга Шпілеўская.

## Рэальная дапамога

**Член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК** расказала, што вопыт дапамогі ўразлівым катэгорыям грамадзян у халодны перыяд года маюць усе вобласці: не раз у маразы арганізоўваліся пункты абагрэву і з гарачым півом. У кожнай з абласных арганізацый Чырвонага Крыжа ёсць палаткі, цеплавыя пушкі і іншы інвентар, які можна задзейнічаць у дапамозе тым, хто зараз вострa яе патрабуе: дзеці, старыя і жанчыны.

Гэтую прапанову падтрымалі з адной папраўкай: неабходна зладжаная скаардынаваная работа з тым, каб пазбегнуць любых правакацый і не дапусціць далейшай эскалацыі канфлікту.

Аб вопыце, які мае Беларускі саюз жанчын у рабоце з бежанцамі, расказала яго **старшыня Алена БОГДАН**.

Паводле яе слоў, БСЖ упершыню звярнуў увагу на сітуацыю з бежанцамі сёлета ў пачатку жніўня, калі на граніцы Воранаўскага раёна загінуў малады мужчына.

— Тады, напэўна, гэта паказала адзінства нашага саюза жанчын, калі Воранаўская раённая арганізацыя выйшла на месца, дзе загінуў малады чалавек, і выказала словы жалю і спачування родным, якім у хуткім часе давядзецца пачуць гэтую жахлівую навіну, — расказала яна.

Акрамя таго, Беларускі саюз жанчын 23 жніўня наведаў дом для часовага знаходжання бежанцаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Прывёз туды неабходныя рэчы, падарункі, прадукты харчавання.

— Па меры таго як развівалася сітуацыя, мы не маглі заставацца раўнадушнымі — гэта было ўжо адзінае памкненне вялікай колькасці членаў БСЖ: 27 верасня мы выступілі з заявай, дзе звярнуліся да калектыўнага Захаду, які вінаваты ў тым, што адбываецца ў краінах, адкуль бягуць гэтыя людзі, — перакананa лідар жаночага руху. — Таму што гэта навязванне чужой ідэалогіі, распальванне ваенных дзеянняў за псеўдадэмакратыю, аб якой яны кажуць.



Наступным крокам жаночай арганізацыі стаў зварот да замежных праваабаронцаў, маўляў, мы гатовыя хадайнічаць перад Дзяржаўным пагранічным камітэтам, мясцовымі органамі ўлады, каб разам адвезці дапамогу групе афганцаў, якая знаходзіцца на нейтральнай тэрыторыі граніцы:

— Давайце дапаможам ім, і вы на ўласныя вочы ўбачыце, што рэальна адбываецца з аднаго і з другога бакоў. На жаль, на наш заклік не адгукнуліся праваабаронцы Захаду, са сродкаў масавай інфармацыі былі беларускія і расійскія тэлеканалы, — паведаміла Алена Богдан.

БСЖ тады адвёз неабходныя прадукты харчавання, цёплае адзенне і медыкаменты. Паводле яе слоў, такія акцыі працягваюцца з верасня.

— Канешне, асноўную нагрузку бярэ на сябе Гродзенская абласная арганізацыя — так склалася тэрытарыяльна. Але ўбаку не застаюцца і іншыя першасныя арганізацыі, аб'яднаныя арганізацыі, — расказала яна. — Напрыклад, «Беларусбанк» сабраў шмат прадуктаў харчавання, адзення і абутку. Члены БСЖ, якія працуюць у розных сферах, прывозілі іх і дапамагалі бежанцам.

Лідар БСЖ падкрэслівае, што ў гэтай справе дастаткова памагатых:

— Нас падтрымалі іншыя грамадскія арганізацыі, простыя людзі, мы дастаткова шчыльна супрацоўнічаем з Чырвоным Крыжам. Але, на жаль, за гэты час да нас не звярнуліся СМІ з іншых краін, каб скарыстацца нашай дапамогай і паказаць тое, што ёсць на самай справе на граніцы, — выказвае жаль Алена Богдан.

## Трэба даносіць праўду!

Падводзячы вынікі круглага стала, Наталля Качанава звярнулася да ўсіх нераўнадушных жанчын:

— Зараз вы павінны сустракацца з людзьмі, у калектывах, пішыце звароты (не чакайце падказак, рабіце, як лічыце патрэбным), галоўнае — каб гэта было на карысць нашай краіны і нашага народа, — акцэнтавала ўвагу спікер.

Яна адзначыла, што час спакойнага і няспешнага жыцця прайшоў, змянілася краіна, свет у цэлым:

— Усё мяняецца вельмі хутка. З дапамогай электронных СМІ свет пераварочваецца незразумела, якім чынам: хлусня, фэйкі скажаюць рэальнасць, робяць усё, каб дыскрэдытаваць сумленных людзей, — кажа Наталля Качанава і нацэльвае жаночы актыў. — А мы павінны зрабіць усё, каб сваім нашчадкам мы пакінулі краіну, у якой давялося пажыць самім.

Яна перакананa: ад кожнага з нас залежыць будучыня:

— Сустрэнецеся, паразмаўляеце, пераканаеце ці не, няважна, зерне сумнення пасееце, — заклікае яна. — Мы зараз усе павінны не проста казаць, а крычаць, таму што мы за праўду!

***Вольга АНУФРЫЕВА,***
***фота БелТА.***

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Слухай сваё

# ПРЫГОДЫ КАМІСАРА МЕГРЭ — У ПРЭМ'ЕРНЫМ РАДЫЁСЕРЫЯЛЕ

**Да 96-й гадавіны Беларускага радыё з 15 да 28 лістапада на Першым нацыянальным канале — прэм'ера дэтэктыўнага радыёсерыяла «Мегрэ і чалавек на лаўцы» паводле аднайменнай аповесці Жоржа Сімянона.**

Упершыню ў гісторыі айчыннага радыёвяшчання ў эфіры Першага нацыянальнага канала прагучыць 14-серыйная аўдыяпастаноўка. Літаратурнай асновай серыяла стала аповесць класіка дэтэктыўнага жанру — французскага пісьменніка бельгійскага паходжання Жоржа Сімянона «Мегрэ і чалавек на лаўцы» ў перакладзе на беларускую мову Алеся Асташонка. Тэкст папоўніць вялікую калекцыю аўдыяпастановак айчынных і замежных аўтараў, якія ёсць у фондах Беларускага радыё.

Над праектам працавалі аўтар радыёп'есы, пісьменнік Уладзімір Сцяпан, рэжысёр пастаноўкі Алег Вінярскі, кампазітар Дзмітрый Даўгалёў, гукарэжысёр Валерый Бяляеў, рэдактар і кіраўнік праекта Галіна Шаблінская.

У галоўных ролях задзейнічаны беларускія майстры сцэны: заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Аляксандр Гарцуеў (Аўтар), артыст Ігар Сідорчык (Мегрэ), народны артыст СССР Генадзь Аўсяннікаў (стары бухгалтар), заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Андрэй Душачкін і Аляксандр Шароў (паліцэйскія), заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Аксана Лясная (мадам Турэ), заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ганна Маланкіна (Антуанета Машэр), артыст Аляксандр Вергуноў (акрабат Шрамэк).

Дэтэктыўны радыёсерыял «Мегрэ і чалавек на лаўцы» будзе выходзіць на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё штодня з 15 да 28 лістапада раніцай у 10.10 і ўвечары ў 20.20, а таксама на сайце радыё.бел. А каму важна заставацца ў курсе апошніх падзей у краіне і свеце, сачыць за анонсамі літаратурна-мастацкіх эфірных прэм'ер, то знайсці цікавую інфармацыю можна на афіцыйным сайце Першага нацыянальнага канала www.radio1.by, а таксама ў telegram-канале «Радио_1».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 152

**Увага, бліцконкурс.**

Сёння прапануўваецца пяць пазіцый бліцконкурсу, якія падабраў наш актыўны чытач Сяргей Бурко з Оршы. За правільнае рашэнне кожнага задання налічваецца адно ачко, дадатковыя ачкі можна атрымаць за пабочнае рашэнне альбо доказ невырашальнасці. Пераможца бліцконкурсу атрымае прыз ад С. Бурко. На тое, каб даслаць адказы, адводзіцца два тыдні.

**№ 127**



**№ 127**

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, f2, h2, e3, f4, e5 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** a3, c3, b4, c5, b6, e7 (7).

Гэтая пазіцыя з прыгожай камбінацыяй размяшчалася ў розных выданнях, і аўтары ўказваліся розныя. У адным фігураваў У. Сласцін, у іншым — А. Саўчанка.

**№ 128** Іван Івацка (г. Вінніца, Украіна).

**Белыя простыя шашкі:** e1, f4, h4, e5, g5, a7 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b4, c5, b6, h6, c7, b8 (6).

**Аўтарскае рашэнне:** d6(g3?), f2, e3, c7, b8 X.

**№ 129** Анатоль Ныч (г. Белгарад-Днястроўскі, Адэская вобласць, Украіна).

**Белыя простыя шашкі:** f2, h2, g3, h4, a5, c5, a7 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, c3, d6, h6, e7, b8, d8 (7).

Наступныя дзве кампазіцыі бліцконкурсу склаў Міхаіл Левандоўскі (с. Ланіўка, Львоўская вобласць, Украіна). Яго шашачныя творы вельмі часта маюць практычную расстаноўку.

**№ 130**

**Белыя простыя шашкі:** c1, g1, d2, h2, e3, g3, h4, g5 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a5, e5, b6, h6, c7, d8, h8 (8).

**№ 131**

**Белыя простыя шашкі:** b2, c3, g3, b4, d4, h4, e5, h6 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** b6, d6, a7, c7, g7, d8, f8 (7).

Наступныя кампазіцыі па-за конкурсам складзеныя ў міжнародныя шашкі (шашкі-100) вядучым аддзела.

**№ 132**

**Белыя простыя шашкі:** 37, 34, 29, 23, 24, 19, 20 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** 38, 32, 28, 22, 12, 15, 9, 2 (8).

**№ 133**

**Белыя простыя шашкі:** 41, 43, 34, 29, 21, 23, 24, 19, 20 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** 32, 28, 22, 17, 12, 15, 7, 9, 10 (9).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Выпуск № 151 ад 29.10.21.**

№ 121 1. a1-b2 b6:d4 2. b2-c3 d4:b2 3. b4-c5 d6:b4 4. f4:f8 h2:f4 5. f8:c1 f4-g3 6. e1-d2 h6:f4 7. d2-e3 f4:d2 8. c1:h2 g7-f6 9. h2-g1 f6-g5 10. g1-e3 g5-h4 11. e3-f2+

№ 122 1. d4-e5 f6:f2 2. h4:d8 b6:d4 3. d8:g1 a3:c5 4. g1:b6 a7:c5 5. d2-c3 +

№ 123 1. d4-e5 f6:f2 [ 1...b6:f2 2. b4-a5 f6:d4 3. h4:g1 ]

2. h4:h8 b6:d4 3. h8:a1 a3:c5 4. d2-e3 f2:d4 5. a1:b6 c5-b4 6. b6-a5 b4-a3 7. a5-c3+

№ 124 1. b6-c7 b4:f4 2. g1:c5 b8:b4 3. a5:c3 e5-f4 4. d4-e5 f4:d6 5. c3-d4+ (калі па правілах рускіх шашак чорныя паб'юць 2. e5:c3 3.c7-d8, выратоўвае ахвяра 3...в8-с7 і 4...с3-в2=

№ 125 1. 43-38 32:34 2. 40:18 37:46 3. 17-12 46:23 4. 12:01 23:07 5. 01:25 09-14 6. 25:09 03:14 7. 35-30 14-19 8. 30-24 19:30 9. 45-40 +

№ 126 1. 43-38 32:34 2. 40:18 37:46 3. 17-12 46:23 4. 18:20 07:18 5. 20-14 19:10 6. 15:31+

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва: Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

*Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда»;*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

Сядзі і глядзі

# Шляхамі беларускіх кампазітараў

**У мінулую нядзелю на «Беларусь 3» стартаваў паказ дакументальна-пазнавальнага цыкла «Кампазітары Беларусі». Генетыка, асяроддзе, адукацыя альбо прыроджаны дар — што абуджала талент у беларускіх музычных геніяў розных часоў? Адказы на гэтае і многія іншыя пытанні гледачы змогуць адшукваць у кампаніі стваральнікаў праекта.**

У першым выпуску паказалі творчасць кампазітара, дырыжора, педагога, народнага артыста СССР Яўгена Глебава. У сваім аўтарскім метадзе ён апеляваў да існуючага і дзеючага музычна-гістарычнага поля, дзе здолеў стварыць уласны музычны стыль з найшырэйшым дыяпазонам пачуццяў і настрояў. Разнастайнасць тэм, сюжэтаў, вобразаў, яркасць індывідуальнай манеры і прафесіяналізм зрабілі музыку Глебава з'явай сучаснага музычнага мастацтва і вылучылі кампазітара ў першыя шэрагі мастакоў агульнаславянскай культуры...

Не менш цікавыя і каларытныя творчыя і жыццёвыя біяграфіі хаваюцца за імёнамі Мікалая Аладава, Яўгена Цікоцкага, Сяргея Картэса, Ігара Лучанка, Іосіфа Жыновіча, Анатоля Багатырова і іншых. Беларусь ведае шмат творцаў, якія ўзбагацілі не толькі нацыянальны, але і сусветны музычны працэс. Іх творы сталі візітоўкамі нашай краіны, вывучаюцца ў кансерваторыях і акадэміях і дагэтуль застаюцца ў рэпертуары шматлікіх музычных калектываў.






Кожны выпуск праекта «Кампазітары Беларусі» прысвячаецца адной са знакавых асоб у гісторыі айчыннага музычнага мастацтва. Разам з музыказнаўцамі, крытыкамі, дырыжорамі, вакалістамі і інструменталістамі сацыякультурны тэлеканал пагартае старонкі творчай біяграфіі і нотных сшыткаў самых вядомых прадстаўнікоў акадэмічнай, фальклорнай і эстраднай музыкі, а іх эталонныя творы прагучаць у выкананні прафесійных калектываў. У наступным выпуску 14 лістапада нас чакае знаёмства з асобай Уладзіміра Солтана. Аўтар шэрагу інструментальных твораў і оперы «Дзікае паляванне караля Стаха», якая ўдастоілася Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Жанравая разнастайнасць, інтанацыйная дакладнасць і насычаная эмацыянальнасць — так характарызуюць музыку маэстра. Думаю, пасля прагляду праграмы, прысвечанай творчасці кампазітара, кожны зможа адкрыць для сябе новыя старонкі ў яго біяграфіі.

# Увасабленне таленту

**Сёлета свой юбілей адсвяткавала народная артыстка Беларусі мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» Валянціна Гаявая. Для прыхільнікаў знакамітага калектыву 14 лістапада ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала пакажуць канцэрт «Ад смутку да вясселля», прымеркаваны да святочнай даты іх стваральніцы.**

Аўдыторыю чакаюць прыгожы і эмацыянальны харэаграфічны спектакль са шчымлівымі, лірыка-драматычнымі нумарамі. У пастаноўцы выразна гучыць тэма трагічнага лёсу жанчыны падчас вайны... Аднак не абыйдзецца і без свята, трыумфу кахання і светлай надзеі, што ўбачым у кампазіцыі «Беларускае вяселле» (яе складаюць гулліва-жартаўлівыя танцы-сцэнкі).

А вось у другім аддзяленні канцэрта гледачам прадставяць найлепшыя фальклорныя нумары з залатога фонду рэпертуару ансамбля. Не згубіце магчымасць атрымаць задавальненне і ўбачыць увасабленне таленту вялікага майстра сцэны.

**Алена ДРАПКО.**

## аўторак, 16 лістапада



### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.30 Зона Х (16+).
9.10, 22.15 **Серыял «След» (16+).**
10.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 **Драма «Айчым» (16+).**
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 **Драма «Чаўночніцы. Працяг» (16+).**
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі часінка.
21.00 Панарама.
21.45 Гэта іншае.
22.05 Беларуская супержанчына.
0.10 Сфера інтарэсаў.
0.50 Дзень спорту.

### Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 17.50 Тэлебарометр.
9.05 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
10.10, 0.35 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.15, 22.20 **Серыял «Шпік» (16+).**
13.30 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.00, 21.20 **Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).**
15.00 «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.55 «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
18.55 **«Клон». Серыял (16+).**
20.00 **Серыял «Сляпая» (16+).**
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Пасхі.
8.05, 12.00, 22.40 Навіны культуры.
8.25, 18.35 **«Браты Карамазавы». Серыял (16+) [СЦ].**
9.25, 17.55 «Апошні дзень». Ян Фрэнкель (12+).
10.00, 16.25 **«Дача». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
11.30 «Гісторыя Беларусі. Бітвы». Бітва на Уле, 1564 г.
12.20 «Беларуская кухня». Суп са шчаўя і яечня з абаранкамі.
12.50 «Наперад у мінулае».
13.15, 21.05 **«Чырвоная капэла». Серыял (16+) [СЦ].**
14.50 «Хроніка Мінскага гета» (12+).
15.45 «Люблю і памятаю».
19.30 «Ваша лато», «Пяцёрачка».
20.00 «Кафедра». «Авідзій і друкарскія станкі: як набыць кнігу ў XVI стагоддзі».
20.10 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.40 «Калыханка» (0+).
22.55 «Рэвалюцыя 1917-га. Эпоха вялікіх перамен». Дак. фільм (16+).

### Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.15 Тэніс. WTA.
9.20 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Лакаматыў» (Яраслаўль).
11.20 Міні-футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2022. Сербія — Беларусь.
13.20, 22.35 Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2022.
15.20 Фігурнае катанне. Гран-пры.
18.10 Плаванне. Ліга ISL.
19.50 Футбол. Таварыскі матч. Беларусь — Ірландыя.
21.50 Спорт-цэнтр.
22.00 Спорт-кадр.
0.40 Тэніс. ВТА.

### АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], 20.30, 0.05 Нашы навіны.
10.00 «Жыць здарова!» (16+)
11.15 «Модны прысуд» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.25 **Фільм «Аскепкі шчасця» (12+).**
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» (12+)
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Масгаз. Справа № 8: пастка» (16+).

### СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], 7.30 [СЦ], 8.30 [СЦ], 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 «Глядзець усім!» (16+).
9.30 «Па сутнасці»
10.40, 0.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
11.35 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.30, 21.00, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.45, 16.50 **«Надзвычайная сітуацыя». Серыял (16+).**
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».
22.00 «P.S.»

### МІР

5.00, 2.40 **Серыял «Метад Фрэйда» (16+).**
8.20, 10.10 **Серыял «Камісарша» (12+).**
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 18.00 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.20 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.00 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25 «Гульня ў кіно» (12+).
20.10 «Слабае звяно» (12+).
21.10 «Назад у будучыню» (16+).
22.10 **Серыял «Кулінар-2» (16+).**
2.05 Мір. Меркаванне (12+).
2.20 «Нашы замежнікі» (12+).
2.30 «Еўразія ў трэндзе» (12+).

### РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35, 14.35 **Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.40 «Кропкі над і» (16+).
17.15 «60 хвілін» (12+).
18.30 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).

21.05 **Серыял «Стэнаграма лёсу» (16+).**
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
— Мы не запрашалі грамадзян Сірыі, Ірака, іншых афрыканскіх краін і з Блізкага Усходу ў вольную, талерантную, цывілізаваную Еўропу. Я кажу ўжо з іроніяй аб гэтым, бо паводзіны прадстаўніка ЕС (а Польшча — актыўны яе член) не ўпісваюцца ні ў якія рамкі міжнароднага права і цывілізаваных адносін да людзей, — акцэнтуе ўвагу Сяргей Рачкоў.

Са свайго боку ён заклікаў народных абраннікаў Польшчы, парламентарыяў звярнуць увагу на сітуацыю, якая складваецца з мігрантамі, уключыцца ў яе вырашэнне мірнымі, цывілізаванымі і канструктыўнымі мерамі.

— Беларускія парламентарыі таксама гатовы да гэтай работы і ўзаемадзеяння, — кажа ён. — У нас з Польшчай існуюць міждзяржаўныя механізмы абмеркавання розных пытанняў па сітуацыі на нашай граніцы. Таму канструктыўнымі метадамі і метадамі ўзаемнага пошуку вырашэння сітуацыі можна выйсці з гэтага найскладанейшага становішча.

Аднак у першую чаргу, лічыць ён, трэба звярнуць увагу на людзей, якія апынуліся ў гэтай небяспечнай сітуацыі:

— Гінуць людзі, жанчыны, ужо і дзеці, таму Еўрапейскі саюз павінен уключацца, не дыскутаваць аб нейкіх санкцыях у адносінах да Рэспублікі Беларусь, нейкіх новых пакетах, а паглядзець, што адбываецца на мяжы Еўрасаюза. Як сябе паводзяць так званая цывілізаваная нацыя ў адносінах да іншых людзей, якія апынуліся ў бядзе не па сваёй віне, — рэзюмуе старшыня профільнай камісіі.

**Сяргей СІВЕЦ:**

# «Ствараюцца перадумовы для паўтарэння гуманітарнай цывілізацыйнай катастрофы»



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:**

— Безумоўна, я хацеў бы адзначыць, што на сённяшні існуюць універсальныя міжнародныя прававыя акты, якія замацоўваюць агульныя прававы статус грамадзян, абсалютную ступень абароны і гарантыі правоў і свабод грамадзян, — Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека 1946 года, міжнародныя прававыя акты аб грамадзянскіх і палітычных правах 1966 года. Але галоўнае — Канвенцыя аб статусе бежанцаў 1951 года, — звяртае ўвагу сенатар.

Ён нагадвае, што яна была распрацавана па ініцыятыве камісіі па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і з'яўляецца краевугольным каменем міжнароднага прававога заканадаўства, якое ў цэлым рэгламентуе ўсе пытанні, звязаныя са статусам бежанцаў, іх правамі, свабодамі, паводзінамі дзяржавы ў частцы абароны грамадзян, якія прэтэндуюць на маёмасную, сацыяльную, прававую і іншыя формы абароны, зыходзячы з неабходнасці выехаць па тых ці іншых прычынах з месца трывалага знаходжання і якія просяць аб адпаведнай дапамозе і прытулку на тэрыторыі той ці іншай дзяржавы.

— Прычым я хацеў бы адзначыць, што шэраг артыкулаў Канвенцыі аб статусе бежанцаў 51-га года ўтрымліваюць нормы, якія прама забараняюць выкарыстоўваць у адносінах да бежанцаў тыя меры ўздзеяння, якія мы сёння назіраем з боку польскіх улад, — кажа Сяргей Сівец. — Гэта прамая забарона на прымусовае вяртанне бежанцаў на тэрыторыю той ці іншай дзяржавы, з якой яны прыбылі. Гэта і абавязкі дзяржавы забяспечыць на час вырашэння працэдурных прававых аспектаў, звязаных з асіміляцыяй, пражываннем, атрымання права на прытулак у той ці іншай краіне мінімальнага стандарту.

Гаворка, паводле яго слоў, ідзе аб забеспячэнні правоў і свабод грамадзян, якія прэтэндуюць на гэтую дапамогу.

— То-бок, па сутнасці, парушаюцца ўсе агульнапрынятыя прынцыпы і нормы міжнароднага заканадаўства, звязаныя з рэалізацыяй прынцыпаў Канвенцыі, якая была падпісана і ратыфікавана на большасцю дзяржаў свету, — перакананы старшыня профільнай камісіі.

Што датычыцца прававых наступстваў, Сяргей Сівец лічыць: павінна адрэагаваць Арганізацыя Аб'яднаных Нацый на парушэнне агульнапрынятых прынцыпаў і нормаў.

— Увесь пакет міжнароднага заканадаўства быў сфарміраваны ў пасляваенны перыяд — пасля Другой сусветнай вайны, і невыпадкова, — звяртае ўвагу парламентарый. — Калі ўсё чалавецтва перажыло гуманітарную катастрофу планетарнага маштабу і замацоўвала міжнародныя забароны і нормы з тым, каб не дапусціць паўтарэння сітуацыі, калі вялікая колькасць людзей патрабуе прававой абароны з боку міжнародных інстытутаў.

Тым не менш не прайшло і стагоддзя, калі зноў паўтараецца тое, што чалавецтва праходзіла ў сярэдзіне мінулага стагоддзя:

— Ствараюцца перадумовы для таго, каб гуманітарная цывілізацыйная катастрофа, якая зараз разгортваецца на нашых вачах на граніцы Беларусі і Польшчы, мела магчымасць паўтарыцца, — акцэнтуе ўвагу Сяргей Сівец. — Мы ні ў якім выпадку не павінны гэтага дапусціць, і міжнародныя інстытуты (у першую чаргу Арганізацыя Аб'яднаных Нацый) павінны адрэагаваць на сітуацыю, якая складваецца на беларуска-польскай граніцы.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

УЛАДА НА СУВЯЗІ

# Дарогі, падаткі і маёмасць

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ правёў прамую тэлефонную лінію.**



Да сенатара званілі з усіх куткоў Беларусі, тэматыка зваротаў таксама была разнастайная: ад маёмасных пытанняў з родзічамі да падаткаў на машыну. Аднак аб усім падрабязней.

Анатоль Дзмітрыевіч з прысталічча абураўся станам мясцовых дарог, маўляў, усім пасёлкам гатовыя падпісацца пад кожным словам.

Старшыня профільнай камісіі паведаміў, што частка праблем па гэтай мясцовасці ўжо знята, частка — у стадыі вырашэння. У любым выпадку, калі ёсць абгрунтаваныя нараканні і канструктыўныя прапановы, іх трэба вырашаць. Таму заяўніку прапанавалі асабістую сустрэчу ў найбліжэйшы час. З чым той і пагадзіўся.

Кірыл Аляксандравіч з пасёлка Чонкі Гарацкага раёна працягнуў дарожную тэму пытаннем: чаму, калі клалі па вуліцы Сонечнай асфальт, не зрабілі 200 метраў у суседнім завулку.

— Усе завулкі мы не злучым, вы павінны гэта разумець, — патлумачыў сенатар. Але ў любым выпадку адпаведнае даручэнне мясцоваму райвыканкаму будзе дадзена, аб выніках заяўніка праінфармуюць.

Алена Міхайлаўна з Рагачова агучыла дзве тэмы: скаргу на якасць медыцынскага абслугоўвання і непаразуменне з падаткам на аўтамабіль з ручным кіраваннем. Што датычыцца першага, яго разглядам зоймуцца спецыялісты аховы здароўя, а па другім Міністэрству па падатках і зборах даручана разабрацца, на якой падставе інвалід І групы заплаціла пакуль што базавую велічыню.

Мінчанін Дзмітрый Сямёнавіч не першы год не знаходзіць агульнай мовы са сваякамі з-за прэтэнзій па лініі спадчыны. Судовае рашэнне па бацькоўскай хаце не задавальняе мужчыну, таму ён звярнуўся да сенатара.

— Самае дрэннае, калі родныя людзі не могуць вырашыць маёмасныя пытанні паміж сабой, — лічыць Міхаіл Русы і па-чалавечы раіць заяўніку не ў чыноўніцкіх кабінетах займацца вырашэннем гэтай спрэчкі, а за сталом перагавораў.

У любым выпадку гэты зварот будзе знаходзіцца на дадатковым кантролі ў Савеце Рэспублікі. Напрыканцы Міхаіл Русы падкрэсліў, што, якімі б ні былі жаданні і прэтэнзіі кожнага з бакоў, усё павінна быць па законе.

Пенсіянерка Ніна Іванаўна з Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці таксама патэлефанавала сенатару з маёмасным пытаннем: жанчына прыватызуе калгасны дом і не згодна з сумай ацэнкі. Адначым, што зараз штомесячная сума выплаты за яго складае 40 рублёў. Міхаіл Русы знаёмы з гэтай сітуацыяй, разбіраўся ў ёй не так даўно з выездам на месца, таму патлумачыў, што ўсе падлікі былі зроблены ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства. У гэтым жанчына можна пераканацца асабіста — ёй дашлюць праведзеныя па яе жыллі падлікі.

Трэба сказаць, што гучалі не толькі пытанні, але і прапановы. У прыватнасці, брастаўчанін Іван Уладзіміравіч мае шэраг прапаноў па зменах у Асноўны Закон краіны.

— Зараз існуе ўнікальная магчымасць агучыць свае ідэі на гэты конт, — нагадаў заяўніку Міхаіл Русы. — Прыме народ ці не, гэта ўжо іншае пытанне, але ўносьце свае прапановы. Рабочая камісія разгледзіць. І, магчыма, штосьці з таго, што вы агучыце, знойдзе сваё адлюстраванне ў новым праекце Канстытуцыі.

Акрамя таго, заяўнікамі агучваліся пытанні пашырэння грамадзянскіх могілак, паляпшэння жыллёвых умоў, якасці паслуг ЖКГ, праваахоўнай дзейнасці і іншыя.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, па ўсіх зваротах парламентарыем дадзены вычарпальныя тлумачэнні. Пытанні, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, узяты на кантроль і накіраваны ў кампетэнтныя дзяржаўныя органы.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**фота аўтара.**

## Наталля КАЧАНАВА:

# «ДУХОЎНАСЦЬ, ШЧЫРАСЦЬ І СУМЛЕННАСЦЬ — ГЭТАГА НАМ СЁННЯ НЕ ХАПАЕ»

**Спікер верхняй палаты парламента сустрэлася днямі з будучымі святарамі — студэнтамі Мінскай духоўнай акадэміі.**


Фота БелТА.

Сустрэчы з моладдзю сталі ўжо традыцыйнымі ў Савеце Рэспублікі, а гэты візіт маладых лекараў душ стаў нечым своеасаблівым. У адкрытай і зацікаўленай размове можна было абмяняцца не толькі думкамі аб цяперашнім стане духоўнасці сучаснага грамадства, але і задаць пытанне, якое хвалюе, і атрымаць на яго вычарпальны і шчыры адказ.

Вітаючы гасцей у сценах верхняй палаты парламента, Наталля Качанава адзначыла, што шчыра рада сустрэць тут слухачоў Мінскай духоўнай акадэміі. Яна расказала будучым святарам аб структуры і сутнасці Савета Рэспублікі:

— Мы працуем так, каб часцей сустракацца з людзьмі розных канфесій, веравызнанняў, сацыяльных слаёў і розных па ўзросце, становішчы. Мы — орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, і тое, як жывуць людзі і з якімі праблемамі сутыкаюцца, для нас вельмі важна, — падкрэсліла яна.

Наталля Качанава патлумачыла, у чым сутнасць дзейнасці сенатараў і яе як старшыні і ўпаўнаважанай кіраўніка дзяржавы па Мінску:

— Мы займаемся распрацоўкай законапраектаў, сустракаемся з людзьмі, працуем са зваротамі грамадзян, якіх дастаткова шмат, і шэрагам іншых пытанняў, — расказала Наталля Качанава. — Як упаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску я займаюся супрацьдзеяннем распаўсюджванню ковід-інфекцыі. Акрамя таго — пытаннямі праваслаўнай царквы і іншых канфесій.

Яна расказала, што ў цэнтры ўвагі сенатарскага корпуса дастаткова часта ўзнікаюць пытанні, што адносяцца да духоўнай сферы:

— У нас узаемныя кірункі ў рабоце (я ніколі не аддзяляю ні дзяржаву ад царквы, ні наадварот), таму што лічу: мы павінны быць глыбока інтэграваныя, — перакананa спікер верхняй палаты парламента. — Бо духоўнасць, шчырасць, сумленнасць — тое, чаго нам зараз не хапае.

Наталля Качанава перакананa, што трэба працаваць разам:

— Калі чалавек сумленны, у яго душы ёсць стрыжань, — кажа яна. — І гэты чалавек будзе жыць для сваёй краіны, будзе разумець, дзеля чаго ён жыве, і зможа асэнсоўваць усё, што адбываецца навокал.

Спікер падкрэсліла: мінулы год стаў выпрабаваннем на трываласць асноўных падыходаў у дзяржаўнай палітыцы, людзей, улады і святароў.

Па сутнасці, гэта ўжо гісторыя, але заспакойвацца рана, лічыць Наталля Качанава і звяртае ўвагу на тое, што адбываецца вакол нашай краіны і ў свеце наогул:

— Гэта вельмі небяспечна. Казаць, што мы перажылі той перыяд і нас нічога не пужае, будзе няправільна, — кажа Старшыня Савета Рэспублікі і звяртае ўвагу на ваенную напружанасць на заходніх межах і ўвогуле — на дзеянні сусветных гульцоў у геапалітычным падзеле свету.

Акрамя таго, яна акцэнтуе ўвагу на сучасных праблемах грамадства, супрацьстаяць якім можна толькі аб'яднаўшы намаганні:

— Для супрацьдзеяння п'янству, алкагалізму, прывіцця павагі да старэйшага пакалення трэба выхоўваць дзяцей, пачынаючы з дзіцячага садка, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Зараз пачынаем актыўна працаваць са школамі, дзіцячымі дашкольнымі установамі ў гэтым кірунку разам з праваслаўнымі святарамі.

Акрамя таго, яна не выключае, што да гэтай работы падключацца настаўнікі і педагогі, з якімі варта правесці дадатковае навучанне па гэтай тэме.

А што кажуць удзельнікі сустрэчы?

**Студэнт 1-га курса магістратуры Мінскай духоўнай акадэміі Аляксей ДЗЯМІДАЎ:**

— На мой погляд, такія сустрэчы вельмі важныя, бо мы зараз жывём у перыяд фарміравання новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Мы са свайго боку хочам высветліць, як новая рэдакцыя Асноўнага Закона паўплывае на рэлігійны стан у нашай краіне.

**Студэнт 1-га курса магістратуры Мінскай духоўнай акадэміі Дзмітрый ВАБІШЧЭВІЧ:**

— Гэтае мерапрыемства паказвае, што народ і дзяржава ўзаемадзейнічаюць. Ёсць зносіны, ёсць магчымасць задаць пытанні, якія цікавяць, і атрымаць на іх паўнавартасныя адказы. Мяне, напрыклад, цікавяць магчымасці супрацоўніцтва святароў са свецкімі ўстановамі адукацыі. Хацелася б пачуць меркаванне аб перспектывах такога дыялогу.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## Анатоль ІСАЧАНКА:

# «Сістэма прафесійнай адукацыі Беларусі рыхтуе высакакласных спецыялістаў, запатрабаваных на айчынных прадпрыемствах»

**Такога меркавання прытрымліваецца віцэ-спікер Савета Рэспублікі, які на мінулым тыдні разам з навучэнцамі Мар'інагорскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа наведаў прадпрыемства БЕЛДЖЫ ў Барысаўскім раёне.**



Па яго ініцыятыве была арганізавана экскурсія для маладых людзей па вытворчых цэхах гэтага прадпрыемства.

— Найлепшай формай папулярызацыі рабочых прафесій у маладзёжным асяроддзі з'яўляюцца менавіта экскурсіі па айчынных прадпрыемствах, — перакананы намеснік Старшыні Савета Рэспублікі. — Прыцягваць моладзь да працы, праводзіць прафарыентацыю, паказваць найлепшыя вытворчасці нашай краіны — не проста важна, а звышважна. Па-першае, мы паказваем дасягненні, што ёсць у краіне. Па-другое, гэта свайго роду патрыятычнае выхаванне. Нам ёсць чым ганарыцца, і трэба гэта паказваць моладзі.

Ён адзначыў, што БЕЛДЖЫ сёння — паспяховае прадпрыемства, прадукцыя якога запатрабавана як унутры краіны, так і за яе межамі.

Па меркаванні Анатоля Ісачанкі, важна разбурыць стэрэатыпы, якія існуюць у маладзёжным асяроддзі і датычацца работы на заводах.

— Не трэба забываць пра тое, што ва ўсім свеце запатрабаваны рабочыя спецыяльнасці, і добра, што ў Рэспубліцы Беларусі захавалася сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі, — перакананы ён. — Маладыя людзі праходзяць курс навучання і маюць магчымасць паглядзець такія прадпрыемствы. Але трэба дакладна разумець, што сёння патрэбныя не проста рабочыя рукі, а высокаадукаваныя, высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія могуць працаваць з лічбавым праграмным забеспячэннем, няважна, у якой галіне ты працуеш. Калі браць сельскую гаспадарку — гэта сістэма дакладнага земляробства, на гэтым прадпрыемстве патрэбны праграмаванне і ўменне працаваць з робатамі.

**Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Мар'інагорскага каледжа Анжаліка СМАЛЯК** лічыць, што, нягледзячы на сельскагаспадарчы профіль установы адукацыі, навучанне не павінна быць вузкапрофільным:

— Навучэнцы павінны арыентавацца па ўсіх кірунках і быць спецыялістамі шырокага профілю, — кажа яна. — Гэта вельмі важна для далейшага развіцця эканомікі і краіны ў цэлым.

Сапраўды, сёння маладыя людзі на ўласныя вочы пабачылі, што прадпрыемства БЕЛДЖЫ — яскравы прыклад сучаснай вытворчасці, дзе многія працэсы аўтаматызаваныя, а для работнікаў створаны максімальна камфортныя ўмовы працы і гарантуецца салідны сацыяльны пакет.

Анатоль Ісачанка звярнуў увагу журналістаў на тое, што маладыя людзі, якія атрымалі прафесійную адукацыю, маюць высокі ўзровень ведаў і навыкаў, і гэта дазваляе ім быць запатрабаванымі на айчынных прадпрыемствах.

Ён упэўнены ў неабходнасці папулярызацыі такой формы работы і зносін з моладдзю:

— У планах у нас — наведванне іншых прадпрыемстваў і сельскагаспадарчага профілю і іншых кірункаў. Мы павінны працаваць з моладдзю — гэта аснова любой дзяржавы, гэта наша будучыня. Як мы яе выхаваем, так і будзем будаваць сваю краіну, — падкрэсліў віцэ-спікер.

Напрыканцы адзначым, што дыялог віцэ-спікера Савета Рэспублікі з навучэнцамі і педагогамі Мар'інагорскага каледжа носіць сістэмны характар. Раней Анатоль Ісачанка сумесна з прадстаўнікамі гэтай установы адукацыі заклалі яблыневы сад, дзе прадстаўлены розныя сарты яблынь, дзякуючы чаму каледж атрымаў рэальны навуковы дапаможнік для сваіх навучэнцаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 11 лістапада 2021 года.**

# РЫБНЫ ДЗЕНЬ

## Якой рыбе аддаюць перавагу спажыўцы, і як яе правільна выбіраць

**Калі вы шчыра ўпэўнены, што найлепшая рыба — гэта каўбаса, а, маючы выбар рыба або мяса, адназначна аддаяце перавагу мясу, то... у гэтым вы не арыгінальныя. Ну не любяць у нас рыбу — можа, не ўмеюць гатаваць? Зрэшты, як і любыя абагульненні, гэта — не зусім карэктна.**


Цэны на жывую рыбку на рыбным кірмашы ў Валяр'янава былі цалкам прымальныя.

Маюцца ў краіне рыбгасы (толькі ў наваколлі сталіцы іх пяць), а раз ёсць прапанова — значыць, відавочна, і попыт. У кожным буйным гіпермаркеце на пачэсным месцы — акварыум. Рыбакоў таксама ў нас дастаткова (але гэта — пра рачную рыбу, а дыетолагам больш падабаецца марская). Ёсць кампаніі, якія пастаўляюць марскую рыбу беларускаму спажыўцу: наша краіна імпартуе больш за пяць дзясяткаў найменняў марской прадукцыі (галоўным чынам рыбы) з больш чым 20 краін. З «эканом-класа» ў крамах прадстаўлены скумбрыя, хек, мінтай, некаторыя віды камбалы, стаўрыда, путасу, мойва. І, вядома, селядзец, практычна нацыянальная страва, якую згадвалі нават класікі нашай літаратуры. З рыбы больш даражэйшай — вялікая камбала, атлантычная траска, сайда, марскі акунь і г. д. З варыянтаў папесціць сябе — асятровыя, вугор, палтус. Напэўна, наўрад ці вы адмовіцеся ад вэнджанай або сушанай рыбкі, асабліва пад піва. І ўсё ж прадаўцы рыбнага базару ў Валяр'янаве кажуць аб недастаткова высокім попыце...

Растлумачым, калі вы не ў курсе: на тэрыторыі, што прылягае да фермерскага рынку «Валяр'янава», у мінулыя выхадныя адбыўся спецыялізаваны рыбны кірмаш. І наогул, з прыходам лістапада рыбныя кірмашы па традыцыі змянілі сельскагаспадарчыя, так што калі вы энтузіяст правільнага харчавання, прыхільнік міжземнаморскай дыеты або проста аматар рыбкі, самы час парадаваць сябе свежай прадукцыяй. Арганізатары рыбнага кірмашу ў Валяр'янаве абяцалі шырокі асартымент сажалкавай і азёрна-рачной рыбы, а таксама прадукцыю яе перапрацоўкі (вэнджана-вяленая рыбная прадукцыя, марожаныя паўфабрыкаты, рыбныя кансервы). У прынцыпе не пакрывілі душой: больш за дзесяць відаў рыбы на прылаўках налічыць атрымалася. Сваю прадукцыю ў Валяр'янаве прывезлі нават з-пад Брэста (быў прадстаўлены, напрыклад, рыбгас «Сялец», што знаходзіцца ў вёсцы Марможава Бярозаўскага раёна).

— А пакупнікоў малавата, — наракае прадавец ААТ «Рыбгас Чырвоная Слабада». — У суботу крыху больш было, а ў нядзелю нешта не прыйшлі. Мы ў Мінску рэдка гандлюем, ёсць і іншыя вытворцы, чыю прадукцыю на «Камароўцы» не знойдзеш, а пакупнікоў мала.

— А што так? Не любяць у нас рыбу?

— Можа, надвор'е падвяло...

— Учора 70 кілаграм рыбы прадалі, для суботы гэта мала, — распавядае дзяўчына каля іншага прылаўка. — Сёння будзе і таго менш...

Але бліжэй да абеду неба перастае хмурыцца, і свабодных месцаў на стаянцы паступова становіцца менш, а каля рыбных прылаўкаў утвараюцца нават маленькія чэргі.

— Смажанага карпа і карасёў у нашай сям'і ядуць з задавальненнем, нават малодшая дачка не адмаўляецца, а яна ў нас малаежка, — дзеліцца пакупнік Алег. — Тым больш гэта свежая рыбка. Марская, кажуць, больш карысная, але ў замарожанай карысці няшмат, а астуджаная каштуе як быццам з золата! Тым больш тут яе няма.

— Дарэчы, таўсталобік хоць і прэснаводны, але змяшчае такі ж тлушч, як і марская рыба. Ён вельмі карысны, выводзіць дрэнны халестэрын, — уступае ў размову прадавец, узважваючы рыбу.

Цэны на жывую рыбку аказаліся цалкам прымальныя: карп прапаноўвалі па 5,80, таўсталобік — па 4,90, амур — па 6,40, буйны карась — наогул па 3,74 (яго куплялі асабліва актыўна). Вусатыя самы, кожны — на 2-3 кілаграмы, адпускалі па 9,80 за кілаграм. А вось цэны на вэнджаную і вяленую прадукцыю — можна сказаць, «шчэрылі зубы», а то і адкрыта «кусаліся». Вяленага шчупака ў Валяр'янаве прапаноўвалі амаль за 20 рублёў кілаграм, падвэнджаную стронгу — па 31,20. Карп і амур халоднага вэнджання ішлі ў сярэднім за 15 рублёў кілаграм, весланос (аказваецца, гэта рыба атрада асятровыя) гарачага вэнджання — 60,56, сцерлядзь — 35 рублёў за кг, а тоўстыя, апетытныя вэнджаныя вугры (пах ад іх ішоў такі, што адразу хацелася есці) — аж па 120 рублёў за кілаграм.

На рыбны базар, дарэчы, прыехалі ў асноўным мужчыны — з сем'ямі і без. Можа быць, таму што да Валяр'янава без машыны дабірацца няблізка, а за рулём усё ж часцей мужчыны. А магчыма, таму што рыба (асабліва вэнджаная і сушаная) — больш мужчынская ежа, чым жаночая?..

Каля прылаўка з рыбным фаршам сабралася невялікая чарга гаспадынь.

— У нас у сям'і рыбу ядуць толькі ў выглядзе рыбных катлет, — дзеліцца пакупніца Ксенія. — У мяне бацька рыбак, дык я юшку і смажаную рыбу з дзяцінства недалюбліваю. А катлеты — аптымальны варыянт: і хутка, і карысна, і адносна нядорага — 5-6 рублёў за кіло фаршу з карпа.

### Раз у тыдзень — рыба

Рыба сапраўды неверагодна карысная, сцвярджаюць дыетолагі. Марская рыба, акрамя таго, што багатая ёдам і бромам, насычае арганізм каліем, магніем, натрыем, серай, фторам, меддзю, жалезам, цынкам, марганцам, кобальтам, малібдэнам. У прэснаводнай рыбе таксама ёсць шэраг неабходных чалавеку мікраэлементаў, такіх як кальцый, магній, ёд, цынк, жалеза, селен. Яны ўмацоўваюць сардэчную мышцу, паляпшаюць работу галаўнога мозгу, падтрымліваюць памяць, нейтралізуюць стрэсавыя станы, умацоўваюць імунітэт. Тлустыя сарты рыбы — крыніца амега-3 (а гэта эластычнасць сасудаў, збавенне ад халестэрынавых бляшак, правільная работа органаў унутранай сакрэцыі і стрававання). Рыба — найлепшая крыніца вітаміну D, якога ў нашым клімаце не хапае. Ужыванне ў ежу рыбы станоўча адбіваецца на стане валасоў, скуры, касцей, зубоў, зроку. Любая рыба — гэта фосфар, які, як вядома, неабходны мозгу для эфектыўнай работы. «Айнмаль ін дэр вохе — фіш»: раз на тыдзень — рыба, гавораць у Германіі. Дарэчы, адкуль узялася традыцыя рыбных чацвяргоў? Аказваецца, гэта савецкая спадчына: указ аб рыбным дні быў выдадзены 12 верасня 1932 года па ініцыятыве Наркамата забеспячэння. Прычынай стаў недахоп мяса, а таксама жаданне прастымуляваць рыбную прамысловасць. Тады ва ўсіх сталовых быў уведзены адзін рыбны дзень на тыдзень, праўда, які менавіта, кожная сталовая вырашала сама. Чацвер стаў афіцыйным рыбным днём у 1976 годзе: пастановай ЦК КПСС установам грамадскага харчавання прадпісвалася гатаваць па чацвяргах рыбныя стравы, а здабывальным арганізацыям — павялічыць аб'ёмы рыбнай лоўлі. Чаму быў абраны менавіта чацвер? Па-першае, яго палічылі самым спакойным працоўным днём перад выхаднымі. А яшчэ — каб збіць рэлігійны каляндар. Як вядома, у праваслаўных посныя дні — серада і пятніца, а ў чацвер есці мяса дазволена. Вось яго і зрабілі рыбным днём у піку вернікам.

Зрэшты, як пішуць гісторыкі, у СССР рыба заставалася ў народнай свядомасці прадуктам другога гатунку ў параўнанні з мясам — так бы мовіць, для камандзіровачных і студэнтаў. Так што, магчыма, некаторае грэбаванне сучаснага айчыннага спажыўца рыбай родам з савецкага мінулага. Бо ў Заходняй Еўропе рыбныя рэстараны лічацца сімвалам вытанчанай кухні і вытанчанага густу, а ў любым меню рыбныя стравы традыцыйна даражэйшыя за мясныя.

Рыба — аснова міжземнаморскай дыеты, якая ўвайшла ў моду ў нашай краіне гадоў 20 таму і да гэтага часу мае прыхільнікаў. Дыета абяцае эфектыўнае зніжэнне вагі і агульнае аздараўленне арганізма.

— Яе асноўны рацыён складаюць рыба і морапрадукты, цэльназерневыя прадукты, раслінныя алеі, арэхі і садавіна. Дыета абмяжоўвае ўжыванне чырвонага мяса, масла, яек і салодкіх прысмакаў, — расказвае **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» Алена МАРГУНОВА.** — У Беларусі да міжземнаморскай дыеты часта ставяцца скептычна, спасылаючыся на тое, што ў нас зусім іншы клімат і генатып. Але гэта не зусім так. Напрыклад, паўночнаеўрапейскія краіны адаптавалі гэтую дыету пад свае ўмовы і назвалі яе скандынаўскай дыетай. У выніку атрымалі выдатныя вынікі па зніжэнні ўзроўню сардэчна-сасудзістых хвароб і росту працягласці жыцця.


А вось цэны на вэнджаную і вяленую рыбную прадукцыю – можна сказаць, «скалілі зубы»…

### Першая свежасць, яна ж апошняя

— У гатаванні рыбы няма нічога складанага, — кажа шэф-повар аднаго з рыбных рэстаранаў сталіцы Павел Дзям'янка. — Са спецый дастаткова солі, свежапамолатага чорнага перцу і лімона. Прычым лімонам апырскваць рыбу лепш перад падачай, а не ў сырым выглядзе. Але смак рыбных страў у першую чаргу залежыць ад першапачатковай якасці прадукту. Таму я раю купляць толькі жывую рачную рыбу і толькі астуджаную марскую. Пры замарозцы змяняюцца фізічныя і біяхімічныя ўласцівасці, а таксама смакавыя якасці рыбы. І гэта працэс незваротны.

Нашы суайчыннікі не часта ядуць рыбу, згаджаецца суразмоўца.

— Мяса для нас больш звыклае, чым рыба. Справа і ў генетычнай памяці, і ў харчовых звычках, закладзеных у дзяцінстве. Мы прывыклі, што сытасць — гэта калі адчуваецца поўны страўнік. З рыбай дасягнуць такога стану больш складана, чым з мясам. Але ўзнікае пытанне: а ці варта? Бо гэта шкодна для здароўя. Ешце павольней — і задавальненне атрымаеце, і здаравейшыя будзеце, і паспееце зразумець, што наеліся, да таго, як пераелі.

**Такім чынам, купляем астуджаную рыбу:**

• Аглядаем жабры: яны павінны быць яркага колеру, чырвоныя або барвовыя.

• Вочы рыбы не павінны быць мутныя.

• Пры націсканні на тушку ўвагнутасць ад пальца адразу ж разгладжваецца.

• І, вядома, важны прыемны пах: якасная рыба пахне марской або рачной вадой — і больш нічым.

— Добрасумленны прадавец заўсёды дазволіць пакупніку панюхаць і памацаць рыбу, — распавядае прадавец «Валяр'янава» Ульяна.

Лічыцца, што астуджаная рыба захоўвае свежасць на працягу двух тыдняў пасля таго, як яе выцягнулі з вады. Але гэта ўжо крайні тэрмін, адзначаюць прадаўцы. Лепш пашукаць «астуджанку» больш свежую.

**Якасная вэнджаная рыба мае паверхню жаўтлявага колеру — ад залацістага да саламянага.**

• Афарбоўка рыбы павінна быць аднастайная — у адваротным выпадку вэнджанне было нераўнамерным і ёсць сыраватыя часткі тушкі.

• У рыбы правільнага халоднага вэнджання мяса не аддзяляецца ад костак.

• Правільна прыгатаваная рыба гарачага вэнджання таксама аднастайнага колеру, але ў яе мяса, наадварот, лёгка аддзяляецца ад костак. Кансістэнцыя тушкі павінна быць шчыльнай і трохі падсушанай.


…а то і адкрыта «кусаліся».

**Выбіраючы марожаную рыбу, памятаем:**

• Не бяром прадукцыю ў непразрыстай упакоўцы, праз якую нічога не відаць.

• Звяртаем увагу на таўшчыню ледзяной глазуры. Калі на ёй расколіны і наплывы — рыбу размарожвалі і замарожвалі зноў. Ледзяная глазур не павінна быць каламутнай або жаўтлявай.

• Якасна замарожаная рыба не павінна згінацца, быць няцвёрдай.

• Занадта яркая мякаць рыбы сведчыць, што вытворца выкарыстаў рэчывы, якія падфарбоўваюць.

• У складзе на ўпакоўцы павінны быць толькі рыба і вада. Ніякіх E452 (гэта рэчывы, што дапамагаюць тушцы ўтрымліваць вільгаць).

• Больш бяспечна купляць цэлую замарожаную рыбу. Філе вытрымліваюць у растворы, які растварае косткі. Але калі ўжо вам падабаецца філе, з пункту гледжання карысці для здароўя, лепш браць тое, якое «на скуры», раяць кухары.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
# ТОАО «ГРОДНО КУЛЬТТОРГ»

| | |
|---|---|
| | **Лот № 1** |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение, инв. № 400/С-50031** (административное здание) площадью 673,4 кв. м, кирпичное, 2 этажа, 1959 г.п., составные части и принадлежности: административная, подвал, подсобное помещение, топочная, тамбур; **кап. строение, инв. № 400/С-82001** (проходная) площадью 7,0 кв.м, кирпичное, 1959 г.п.; **кап. строение, инв. № 400/С-161059** (благоустройство) площадью 339,1 кв. м (покрытие асфальтобетонное – 168,9 кв. м, плиточное покрытие – 170,2 кв. м); **кап. строение, инв. № 400/С-161058** (ограждение территории) протяженностью 4,8 м (ограждение металлическое – 1,0 м, ограждение железобетонных плит – 3,8 м); **кап. строение, инв. № 400/С-34936** (кабельные линии электропередачи) протяженностью 0,5705 км; **кап. строение, инв. № 400/С-34941** (водопроводная сеть дворовая (стальная) протяженностью 0,0185 км; **кап. строение, инв. № 400/С-102940** (тепловая сеть) протяженностью 150,3 м; **кап. строение, инв. № 400/С-103117** (канализационная сеть (фекальная) протяженностью 332,97 м; пожарно-охранная сигнализация; котел отопительный КСТБ-95 |
| Информация о земельном участке | Кадастровый номер 440100000001012002, площадь – 0,1189 га, назначение – для обслуживания административного здания и проходной, право аренды по 06.10.2070 года, в соответствии с генеральным планом г. Гродно земельный участок расположен на территории, предусмотренной под коммунально-обслуживающую и коммунально-складскую зоны. Возможно использование новыми собственниками строений для размещения административно-производственных, коммунально-складских и коммунально-обслуживающих объектов, объектов сопутствующего обслуживания |
| **Местонахождение имущества:** | **Гродненская обл., г. Гродно, ул. Соколовского, 20** |
| **Обременения** | Часть площадей сдается в аренду: инв. № 400/С-50031 (152,5 кв. м – по 04.05.2024 г., 79,2 кв. м – по 24.09.2023 г. |
| **Начальная цена с учетом НДС: 739 392,54 рублей** | Задаток (1 %) – 7 394,00 рублей |

**Сведения о продавце:** ТОАО «Гродно Культторг», г. Гродно, ул. Пушкина, 37А, тел.: 8 (0152) 568291, 8 (029) 1688378

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906

**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 15 дней с момента проведения аукциона. Оплата в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

**Торги состоятся 13 декабря 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| | |
|---|---|
| **Срок подачи документов** | **по 07 декабря 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** |

**Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте www.fincentr.by. Тел. для справок 8 (0152) 621632**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
# ТОАО «ГРОДНО КУЛЬТТОРГ

| | |
|---|---|
| | **Лот № 1** |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение инв. № 400/С-30916** (здание для складирования обуви № 2–3) общей площадью 1570,2 кв. м, кирпичное, 1953 г. п., составные части и принадлежности: гараж, три склада, рампа, сарай; **кап. строение, инв. № 400/С-102939** (уборная) общей площадью 9,8 кв. м, кирпичное, 1999 г.п.; **кап. строение, инв. № 400/С-161061** (благоустройство) общей площадью 608,8 кв. м, **кап. строение, инв. № 400/С-161057** (ограждение территории) протяженностью 122,1 м, **пожарно-охранная сигнализация и запорная пожарная арматура** (в здании для складирования обуви № 2–3, инв. № 400/С-30916) |
| Информация о земельном участке | Кадастровый номер 440100000001012001, площадь – 0,4192 га, назначение – для обслуживания здания складирования обуви № 2–3 и уборной, право аренды по 06.10.2070 года, в соответствии с генеральным планом г. Гродно земельный участок расположен на территории, предусмотренной под коммунально-обслуживающую и коммунально-складскую зоны. Возможно использование новыми собственниками строений для размещения административно-производственных, коммунально-складских и коммунально-обслуживающих объектов, объектов сопутствующего обслуживания |
| **Местонахождение имущества:** | **Гродненская обл., г. Гродно, ул. Соколовского, 20К** |
| **Обременения** | Часть площадей сдается в аренду: инв. № 400/С-30916 (108,4 кв. м – по 24.09.2023 г., 217,7 кв. м – по 30.11.2022 г., 25,74 кв. м – по 03.12.2021 г.; инв. № 400/С-161061 (40,0 кв. м – по 24.09.2022 г.) |
| **Начальная цена с учетом НДС: 644 436,80 рублей** | Задаток (1 %) – 6 444,00 рублей |

**Сведения о продавце:** ТОАО «Гродно Культторг», г. Гродно, ул. Пушкина, 37А, тел.: 8 (0152) 568291, 8 (029) 1688378

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906

**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 15 дней с момента проведения аукциона. Оплата в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

**Торги состоятся 25 ноября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| | |
|---|---|
| **Срок подачи документов** | **по 19 ноября 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** |

Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте www.fincentr.by. Тел. для справок 8 (0152) 621632.
Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 24.09.2021 года

## ОАО «ПИНСКИЙ ВИНОДЕЛЬЧЕСКИЙ ЗАВОД»

**сообщает о проведении 30.11.2021 г. первых повторных электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:**

1) Капитальное строение с инв. номером 240/С-45289, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, Межевский с/с, аг. Межево, ул. Центральная, 62, площадью 640,9 кв. м – 115 000,00 бел. руб. без НДС.
2) Капитальное строение с инв. номером 333/С-21661, расположенное по адресу: Гомельская область, Калинковичский район, г. Калинковичи, ул. Подольская, 18А, площадью 478,7 кв. м – 165 000,00 бел. руб. без НДС.

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by.**

УНН 200110728

## Извещение о проведении 16 декабря 2021 года конкурса на право размещения средств наружной рекламы на территории г. Пинска

| № п/п | Предмет конкурса: Адреса мест размещения средств наружной рекламы на территории г. Пинска | Предмет конкурса: Вид рекламной конструкции | Начальная цена, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Брестская, район остановочного пункта общественного транспорта «Микрорайон Западный», четная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 2 | ул. Брестская, район остановочного пункта общественного транспорта «Завод Искож», нечетная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 3 | пр-т Жолтовского, район остановочного пункта общественного транспорта «Жолтовского», нечетная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 4 | ул. Первомайская, район остановочного пункта общественного транспорта «Белова», нечетная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 5 | ул. Первомайская, район остановочного пункта общественного транспорта «Кинопрокат», четная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 6 | ул. Первомайская, район остановочного пункта общественного транспорта «Микрорайон Северный», нечетная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 7 | ул. Первомайская, район Открытого акционерного общества «Полесье», нечетная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 8 | ул. Первомайская, район остановочного пункта общественного транспорта «Центральная больница», нечетная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 9 | ул. Солнечная, в районе перекрестка с проспектом Жолтовского, нечетная сторона улицы | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 10 | ул. Солнечная, район остановочного пункта общественного транспорта «Микрорайон Луги», четная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 2000 | 200 |
| 11 | ул. Степная, район остановочного пункта общественного транспорта «Товары для дома», нечетная сторона | «пилларс» (без фундамента) | 1500 | 150 |
| 12 | ул. 60 лет Октября, напротив здания Пинского горрайотдела по чрезвычайным ситуациям в районе остановочного пункта | «пилларс» (без фундамента) | 1500 | 150 |

Организатором конкурса является Пинский городской исполнительный комитет: г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, 21, тел. 8 (0165) 31 70 88.

**Конкурс и открытие предложений участников состоится 16 декабря 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, 21, актовый зал.**

*Для участия в конкурсе лицо, желающее принять участие в конкурсе, вносит задаток путем перечисления денежных средств на расчетный счет городского бюджета № BY45AKBB36002040000130000000, открытый в ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, получатель платежа – главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Брестской области, УНП получателя 200676206, назначение платежа 05519.*

Победитель конкурса в течение пяти рабочих дней со дня проведения конкурса обязан будет перечислить на текущий счет, указанный в протоколе о результатах конкурса, сумму средств, предложенную участником за право размещения средств наружной рекламы, а также возместить затраты на организацию и проведение конкурса.

**Заявления и прилагаемые к ним документы принимаются с 15 ноября по 15 декабря 2021 г. по адресу: г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, 21, каб. 25 по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Для участия в конкурсе необходимо представить следующие документы:

- заявление на участие в конкурсе по форме согласно приложению к Положению о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденному постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395;

- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на расчетный счет городского бюджета (за исключением внесения задатка посредством использования автоматизированной информационной системы единого расчетного и информационного пространства);

- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в конкурсе;

- эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе;

- предложения по выполнению условий конкурса. Данные предложения подписываются участником, скрепляются печатью, представляются в запечатанном конверте, являются окончательными и уточнению в ходе конкурса не подлежат.

При подаче документов для участия в конкурсе и заключении соглашения представляются:

- физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

- представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения конкурса определен Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 (далее – Положение).

Конкурс проводится в день, время и месте, указанные в извещении. До начала конкурса его участники проходят регистрацию. До начала проведения конкурса до сведения его участников доводится информация о затратах на организацию и проведение конкурса по каждому предмету конкурса. При проведении конкурса комиссия проверяет соблюдение требований Положения. Открытие предложений производится комиссией в день, время и месте, указанные в извещении. На заседание комиссии с ее согласия могут быть приглашены участники конкурса, специалисты, эксперты, переводчики.

Победителем конкурса признается участник, предложение которого соответствует условиям конкурса. При равных условиях победителем конкурса признается участник, предложивший наивысшую цену. Победитель конкурса объявляется председателем комиссии в день вскрытия конвертов.

При поступлении заявления на участие в конкурсе от одного участника конкурс признается несостоявшимся. В случае соответствия предложения такого участника условиям конкурса продажа предмета конкурса производится этому лицу. При этом к данному лицу применяются правила, установленные для победителя конкурса.

Победитель конкурса в течение пяти рабочих дней со дня проведения конкурса обязан перечислить на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах конкурса, сумму средств, за которую продан предмет конкурса, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение конкурса.

Задаток возвращается всем участникам конкурса, кроме их победителя, в течение пяти рабочих дней со дня проведения конкурса.

Внесенный победителем конкурса задаток учитывается при окончательных расчетах по договору.

По результатам проведенных торгов с победителем конкурса заключается договор на условиях, определенных в протоколе о результатах конкурса. В случае уклонения одной из сторон от заключения договора другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его заключения.

Срок для заключения договора на размещение средства рекламы – 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах конкурса.

Штраф в размере 10 базовых величин уплачивается победителем конкурса, отказавшимся или уклонившимся от подписания протокола о результатах конкурса, договора и (или) возмещения затрат на организацию и проведение конкурса.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества Общества с ограниченной ответственностью «Вилейское Агропромэнерго»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Эл. таль; Эл. таль | 588,00 | 58,80 | 29,40 |
| 2 | Принтер Samsung SCX-4220; компьютер; сканер; принтер Samsung ML-1641; ПЭВМ с монитором; ПЭВМ с монитором; ПЭВМ с монитором; МФУ Canon i-SENSYS MF4450; компьютер; компьютер; компьютер с монитором; картридж; ЖК дисплей Viewsonic va1936a-led; принтер Samsung ML-1615; картридж; принтер Samsung ML-1640; мышь комп. | 1 306,80 | 130,68 | 65,34 |
| 3 | Электр. весы; микроволновая печь Horizont; шкаф металл, 3 шт.; лопата, 2 шт.; телефакс Panasonic UF-S1; весы товарные; шкаф; шкаф; батарейки, 11 шт.; огнетушитель, 14 шт.; флаг; щит пожарный; рукав пожарный, 2 шт.; топор пожарн, 2 шт.; ведро пожар; ведро; багор пожарн.; ведро оцин.; перчатки; галоши; калькулятор; вага ВТН-5; кассовый аппарат; водомерный узел (устан. в здан); контейнер мусор, 4 шт.; аппарат телефон (красный); пробник; испыт. цепь; акустич. система; отвес; картридж; сейф; стол, 2 шт.; стул, 2 шт.; шкаф 3-х; стол письм; стул, 3 шт.; шкаф; тумбочка; обогреватель; стулья мет, 35 шт.; корзина мусора; ложка, 4 шт.; чайник; кружка, 4 шт.; сейф; стул; стол; стол, 3 шт.; шкаф; сейф; стул, 3 шт.; телефон аппарат; калькулятор; корзина мусор, 2 шт.; дорожка 5,5м; акустич. система; аппарат изм. давл.; замок навес; замок навес гараж; калькулятор; флешкарта; аккустич. система; телеф. аппарат; телеф. аппарат; зарядное устройство Duracell; автошины МАЗ555142 | 4 897,80 | 489,78 | 244,89 |
| 4 | Триммер; пила; микроволновая печь Horizont; холодильник ATLANT; лестница; техфен; молоток; топор колун; топор; стол-тумба, 2 шт. | 727,20 | 72,72 | 36,36 |
| 5 | Теодолит; уровень лазерный; лестница; лестница; лазы по бетону; лестница; уровень; линейка; миллиамперметр; рейка нивелирная; штангенциркуль; оптический нивелир; правило; угольник; линейка, 2 шт.; фонарь налобный; рулетка; штангенциркуль | 1 204,80 | 120,48 | 60,24 |
| 6 | Электр. генератор; сварочный полуавтомат; электр. генератор; мегаомметр; лестница; сварочн. аппарат; инвентор свароч; прибор ЭКО-200; измеритель сопротивления ИФН-200; омметр; прибор ТКА-ПКМ (20); индикатор напряжения; омметр; омметр; зарядное устройство; омметр ЭС0212; электростанция; батарея аккум Delta | 1 666,80 | 166,68 | 83,34 |
| 7 | Пылесос стр; штроборез; перфоратор; перфоратор; перфоратор; перфоратор; перфоратор; перфоратор; электрическая дрель-шуруповерт; дрель шуруповерт с аккумулятором; дрель шуруповерт; бороздодел (штроборез); набор отвер; набор отвер; набор отвер; отвертка диэлектрическая, 4 шт.; плоскогубцы; плоскогубцы; ручные тиски; электростанция; шлифмашин. руч. Интерскол УШМ-125/1100Э; отвертка; отвертка; набор щупов | 957,60 | 95,76 | 47,88 |
| 8 | Холодильный шкаф | 432,00 | 43,20 | 21,60 |
| 9 | Установка компресс. Remeza СБ4/Ф-270.LB75; лебедка с кареткой | 945,60 | 94,56 | 47,28 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги

Местонахождение вышеуказанного имущества: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 99

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **13 декабря 2021 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.30) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 12 ноября 2021 года по 16.00 9 декабря 2021 года** |
| **Условия для участия в торгах** | 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту ___, ООО «Вилейское Агропромэнерго», проводимых 13.12.2021.<br>2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр.лица, копия Устава – для юр.лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи.<br>3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.<br>4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.<br>6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.<br>7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – Илья +375 29 395-30-88.<br>8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 |
| **Информация о продавце** | **Общество с ограниченной ответственностью «Вилейское Агропромэнерго» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 29 395-30-88 (222417, Минская обл., г. Вилейка, ул. 1 Мая 99, УНП 600010743)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |




## УЧАСТКОВЫ ДЗЕЙНІЧАЎ СМЕЛА...

Праўду пісаў наш класік: «Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем...»

Неяк, на самым пачатку восені, я і прыехаў. Не паспеў на падворак зайсці, а ўжо расстроіўся. Справа ў тым, што нашу цэнтральную вуліцу досыць часта тады падсыпалі, паднаўлялі, асфальтавалі, і ў выніку яна ўвесь час «падрастала», а наш двор — нібы «асядаў». Нязручна стала заходзіць, а ўжо выходзіць — дык хоць на ўсіх чатырох... І гэта — у добрае надвор'е. Што ўжо казаць пра восень з дажджамі, пра зіму з галалёдзіцай? На добры толк там трэ было нешта зрабіць, ды ўсё не выпадала. А тут...

Ужо за сталом мама стала расказваць навіны. І апроч іншых выдала гэту: сусед — па той бок дарогі — ставок сабе выкапаў, на месцы былога балотца пачынае рыбу разводзіць...

Мне, вядома ж, захацелася паглядзець на гэта, пра ўсё распытаць. Прыйшлося перайсці дарогу.

Бачу, ставок там і праўда атрымаўся на славу! А побач з ім — сапраўдная гара з выкапанай зямлі. І ў мяне адпаведна «ідэя»: а што, калі яе «перанесці» на новае месца і там разраўняць?

З гаспадаром я дамовіўся лёгка: «Бяры, браток, і нават не дзякуй, — сказаў ён. — Падсыпай усё, што хочаш».

Заставалася прыдумаць, як (канкрэтна) гэта зрабіць? І тут мне яшчэ раз усміхнулася ўдача: на дарозе ўгледзеў пагрузчык фірмы «Амкадор». Я наперарэз. Маўляў, так і так, зрабі... А зробіш — дык будзе...

За хлопцам справа не стала: тры каўшы перавезенай глебы, і той круты пад'ём на дарогу ўжо стаў пакатым: спярша каля нашай хаты, а потым — па суседстве — каля дома сястры. Кіроўца малайчына: тыльным бокам каўша зямлю ўшчыльніў, падраўняў. Заставалася яшчэ рыдлёўкай нешта падправіць.

На маміным двары я ўправіўся ўмомант, а вось у сястры прыйшлося затрымацца: там з-пад зямлі кавалак арматуры тырчаў. Яна за сабой цягнула жалязяку...

Намучыўся, пакуль даставаў! А справіўся, шпурнуў пад плот і... знямеў, бо там быў не проста «выкапень» — там была... міна. І, выходзіць, гэта над ёй я хвілін з пятнаццаць арудаваў ломам і рыдлёўкай?..

Дагэтуль помню свой стан: раптоўная бязважкасць... Ціш і аднекуль словы Сакалова з «Лёсу чалавека»: «Толькі халадком ад яе павеяла»...

А далей усё закруцілася. Я паззваніў «надзвычайнікам» (у нашай вёсцы пост МНС). Тыя звязаліся з участковым. Ён мігам прыехаў! Убачыў, што міна ёсць, сваёй службовай машынай перакрыў дарогу (транспарт пайшоў у аб'езд), мяне прагнаў падалей (нават рыдлёўку ўзяць не дазволіў)... Сам застаўся...

З акна нашай хаты было добра відаць, што ўжо цямнее, што ён сядзіць...

Гледзячы на такую самаахвярнасць, мы з мамай шчыра яму спачувалі, перажывалі...

Так прайшоў вечар, за якім была ноч.

А на досвітку мы з мамай падхапіліся — і адразу ж да акна: паглядзелі ды парадаваліся, што ўсё там спакойна. Значыць, сапёры прыехалі і міну забралі... Цікава было, колькі наш Анiскін дзяжурыў?

...Сітуацыю трохі пазней праясніў знаёмы ратавальнік. Сказаў, што сапёры сапраўды прыязджалі — раніцай. Забралі небяспечную знаходку, завезлі на палігон, каб знішчыць...

Аднак забіралі яе не з-пад нашых вокнаў, а з паста МНС, куды з перасцярогамі (гэта значыць, у багажніку машыны, з «мігалкай», памаленечку) міну перавёз участковы.

Ну, сапраўды, ночы ў верасні ўжо не цёплыя і бавіць іх на вуліцы... Калі можна ў цяпле...

А пост знаходзіўся за ваколіцай, побач — ні жылых дамоў, ні чужых людзей (сваіх папярэдзілі, каб за гаражы — ні нагой)...

Трэба дадаць, што міна была з часоў мінулай вайны. У балоце, відаць, добра адсырэла, а высахнуць і бабахнуць мы з участковым ёй проста не далі. Я спрытна арудаваў ломам-лапатай і хутка дастаў гэту «штучку» з зямлі. Ён таксама дзейнічаў смела. Можа, нават занадта...

Карацей, вясёлая была гісторыя, з добрай порцыяй адрэналіну. А галоўнае — са шчаслівым канцом.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*



## ЯК ПАСВАРЫЛІСЯ ІВАН ІВАНАВІЧ І ІВАН ПЯТРОВІЧ

...Кажуць, у час адмысловага абеду адна дама папрасіла Альберта Эйнштэйна папулярна патлумачыць сэнс яго тэорыі адноснасці.

Вучоны на нейкае імгненне задумаўся, а потым, усміхнуўшыся той жанчыне, спытаў: «Як вы лічыце, дзве валасінкі на галаве — гэта многа ці мала (усе паглядзелі на абсалютна лысага спадарожніка дамы)?.. А ў талерцы?»

Адказ быў відавочны — Энштэйну заставалася хіба дадаць, што ўсё адносна...

Прысутныя з ім дружна згадзіліся, а нехта нават успомніў, што бываюць людзі гідлівыя, з-за стала іх можа «выгнаць» нават здыхлік-камар на «беразе» талеркі. Што ўжо казаць пра іншае?

...Але ж я скажу.

Мой знаёмы (назавём яго Іван Пятровіч) жыве на два дамы: у халодныя месяцы — у гарадской кватэры, з мая да верасня — на лецішчы. Іх, такіх дачных паселішчаў, і было ў нас нямала. Ды яшчэ ж і ўтварыліся. Найболей — з вёсак, што абапал чыгункі. Старыя сяляне там паўміралі. А іх жыллё нашчадкі альбо прадалі наезджым пад дачы, альбо наязджаць сталі самі, каб потым шчыраваць на сотках.

Такім чынам і ў Пятровіча сусед з'явіўся — таксама Іван, толькі Іванавіч: хаціну побач купіў, на свой капыл абсталёўваў яе пад дачу, калі-нікалі звяртаўся па дапамогу...

Факт, што яны, гэтыя два Іваны, пасябравалі. Маглі разам нешта зрабіць, маглі ў альтанцы, што на агульнай мяжы, бутэлечку выпіць, якую па чарзе і загадзя бралі ў аўталаўцы.

Дык вось неяк сышліся яны. Паселі. Толькі разлілі, адкуль ні вазьміся — восы... І адна з іх прамой наводкай у шклянку да Івана Іванавіча.

Той, бедны, змяніўся з твару, падняў пасудзінку і ўжо збіраўся выліць віно...

Пятровіч спыніў. Сказаў: «Пачакай. Дай сюды».

Забраў шклянку, сваімі заскарузлымі пальцамі (чым яшчэ больш збянтэжыў гідлівага суседа) злавіў у віне насякомае, выкінуў на траву, і — не прападаць жа дабру?! — залпам асушыў пасудзіну...

Тут жа паставіў на стол — хацеў выліць туды рэшткі каштоўнага напою, але сябар не даў: з-пад рук выхапіў шклянку — пабег да студні, доўга і з мылам мыў...

Але ў той раз «пірушка» завяршылася мірна. У наступны...

Тыя ж два Іваны сышліся ў той жа альтанцы, дасталі пляшку і шклянкі... Іван Іванавіч падаўся ў дом, бо забыўся цыгарэты, Іван Пятровіч стаў разліваць віно ды газетай адганяць назойлівых вос... Адну з гэтых нахабніц дык нават «дагнаў» і прыстукнуў, потым, нежывую, укінуў у шклянку сябра.

Той, вярнуўшыся, глянуў і спытаў: «Ты навошта гэта зрабіў?» — «Я ні пры чым, — стаў аднеквацца Пятровіч. — Яна сама ў віно ўляцела. Помніш, як тады?» — «Тады яна жывая плавала. А цяпер... Дык ні мне, ні табе!»

Схапіў ён шклянку, выліў віно пад плот і рушыў дадому.

...Вінаваты Іван Пятровіч потым расказваў мне, што пакрыўдзіў чалавека... Што той з ім не тое што размаўляць — нават вітацца перастаў. І ў горад нядаўна з'ехаў, хоць восень і цёплая. Мог бы пажыць...

Я паспрабаваў рассудзіць гэтых мужчын. Сказаў, што зіма будзе доўгая: што за яе ўсе крыўды, дасць бог, збудуцца. А вясна дык яшчэ і памірыць! Трэба толькі дажыць.

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

*Ад яе ж і, напэўна, яшчэ раз. Як пераканаліся нашы чытачы, «Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы» не хлусіць: гісторыі бываюць абсурдныя, амурныя, анекдатычныя, банальныя, абуральныя, дзівосныя, ідыёцкія, камічныя, кранальныя, павучальныя, скандальныя, трагікамічныя... Усяго — каля сотні слоў!.. А ўжо колькі праўдзівых — за час існавання рубрыкі...*

*Для тых, хто забыўся, нагадаем, што ў апошнія гады яна стала конкурсам на найлепшую... Вынікі яго падводзяцца ў пачатку года. Журы — і вялікае чытацкае, і малое рэдакцыйнае — працуе. Так што пішыце. І, калі ласка, — з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі!*

Неасабісты суб'ектыў



# Зямельны падатак

## Што і каму мы павінны, калі становімся гаспадарамі

У маёй паштовай скрыні рэдка з'яўляюцца якія-кольвек канверты: эпісталярны жанр у сваім першапачатковым выглядзе сышоў на нішто, ператварыўшыся ў віртуальныя пісьмы, якія проста сціраюцца з памяці — і гаджэта, і чалавечай. Але адзін карэспандэнт ужо некалькі гадоў дасылае свой допіс на паперы ў абавязковым парадку, праўда, толькі раз на год. Дзяржынская падатковая інспекцыя нагадвае пра падатак на зямлю і нерухомасць, які належыць заплаціць да 15 лістапада. Менавіта з гэтай паперы я ведаю, якую плошчу займае наш прысядзібны (дачным я яго ніколі не назаву, хаця, па сутнасці, ён такі сёння і ёсць) участак у вёсцы. Чатырнаццаць з паловай плюс дзевяць сотак. За якія налічана падатку 8 рублёў 19 капеек за год. Мізэрная цана за права валодаць і карыстацца амаль чвэрцю гектара зямлі за сорак кіламетраў ад сталіцы.

ЗЯМЛЯ (дакладней, участкі з пабудовамі) у нас дарагая. Хоць глеба і не вельмі ўрадлівая — суглінкі, на якіх у мокрае лета ўсё вымакае, а ў засушлівае — усё камянее. Але ж паўгадзіны язды да Мінска на машыне. Таму праблема пустых ці закінутых дамоў тут увогуле невядомая. Дый хаты прадаюцца рэдка — нават калі гаспадары паміраюць, гарадскія спадчыннікі не спяшаюцца развітвацца з такой выгаднай маёмасцю, асабліва калі гэта маёмасць — родная хата, у якой вырас. Калі ж здараецца такая неспадзяванка — дык гэта калі памірае які адзінокі дзед і бабуля, што не мелі сваіх дзяцей, ці ў дзяцей-унукаў ёсць свае дамы на вёсцы. Тады хаты выстаўляюцца на продаж і нават у наш няпросты час ідуць як гарачыя піражкі, прычым нятанна: нават за самую лядашчую пабудову менш за дзесяць тысяч долараў ніхто не просіць. Сёлета да вёскі падвялі прыродны газ, і, калі набярэцца патрэбная колькасць ахвотных займець гэту выгоду ў сябе, трубапровад пракладуць і па вуліцы, і тады цэны на нерухомасць і пустыя ўчасткі ўвогуле падскочаць. Праўда, пытанне з газам пакуль адкрытае, многія сумняваюцца, ці варта ўкладаць вялікія грошы ў выгоду (пяць тысяч — толькі каб правесці да дома), якая апраўдвае сябе, калі жывеш круглы год: гарачая вада і ацяпленне — сапраўды рэчы важныя. Але калі прыязджаеш толькі ў водпуск ды на выхадныя летам, калі той газ патрэбны больш для прыгатавання ежы, — дык ужо задумаешся і пачынаеш лічыць: куды паставіць газавы кацёл (які каштуе каля тысячы), калі ў хаце з печчу няма прыстаўнага памяшкання, колькі будзе каштаваць правесці батарэі ацяплення і ці вытрымаюць гэтыя маніпуляцыі драўляныя сцены? І ўрэшце — навошта ўся гэта нятанная катавасія, калі кубаметр бярозавых дроў каштуе семдзесят рублёў, а газавыя балоны, якія на дачны сезон пры ўсіх варэннях-закатках трэба самае большае два, — па шэсцьдзясят за штуку... Так што пытанне, ці будзем мы газіфікаваныя, застаецца пакуль адкрытым.

ТЫМ не менш вёска яшчэ і забудоўваецца. Прычым не на ўскраінах, а з сярэдзіны. Яшчэ адна асаблівасць спадчыны: яна толькі там, дзе стаяць пабудовы. Калі ж участак, дзе быў толькі сад і агарод, у апошнія пару дзесяцігоддзяў не быў афармлены належным чынам, пасля смерці ўласніка, які быў тут прапісаны, новыя гаспадары гэты кавалак зямлі ў спадчыну не атрымліваюць, ён выстаўляецца на аўкцыён. Той, хто яго набывае, павінен абавязкова пачаць будавацца. Вось так і з'явілася ў нас пад вокнамі яшчэ адна хата. А было ж так прасторна — дзядзька Анатоль, які жыў на тым баку вуліцы, на сваім участку праз дарогу гадаваў толькі пару яблынь ды кусты парэчак. А каля рэчкі ўвогуле вырас невялікі бярозавы гай, дзе ўвесну дзядзька спускаў сок. Пасля дзядзькавай смерці хату прадалі адным людзям, а сад каля рэчкі купілі з аўкцыёну іншыя. Цяпер акрамя Анатолевых бярозак можна любавацца на дыхтоўны дом, які новыя землеўласнікі (людзі гарадскія і нябедныя) пабудавалі літаральна за лета, і на ўсё, што побач адбываецца. Такое вось неспадзяванае ўшчыльненне і бясплатнае кіно.

У нас з гэтым прасцей: на другім участку, што праз дарогу ад хаты, — склеп і хлеў, таму пытанняў уласнасці пры афармленні спадчыны не было. Плаці падатак і карыстайся на здароўе. Тут паўстала іншае пытанне: што з гэтымі дваццаццю трыма з паловай соткамі рабіць? Бо гэта раней былі свінні-карова-куры, і зямлі, якой тады было і больш, не хапала, і кожны яе лапік быў заняты, нават у двары раслі кусты агрэсту і яблыні, паўсюль расла бульба, а калі не бульба, дык жыта, а гарбузы дзеля эканоміі месца садзілі не ў грады, а на межах, і яны пляліся па вузкіх паўмежках, і ўсе на іх спатыкаліся...

ЦЯПЕР лішняя зямля (пачула б гэта мая бабка — «лішняя зямля»!) — дадатковы клопат. Ну не пасадзіш жа на дваццаці сотках агарод (бульбу «у прамысловых маштабах» мы не садзім прынцыпова). Пакрысе пашыраецца сад, але да рэчкі ўсё роўна яшчэ далёка. Даводзіцца касіць, зграбаць, вынасіць. А як інакш — не гадаваць жа пустазелле на сядзібе. Нават наскрозь гарадскія новыя суседзі гэта зразумелі. Таксама косяць, няўмела зграбаюць траву ў кучы. А сёлета не вытрымалі — ускапалі лапік цаліны, пасадзілі агуркі. Калі вырас першы — мы адразу і пачулі, і ўбачылі: спачатку радасна-здзіўлены воклік гаспадыні, пасля яе ўрачыста-рытуальныя скокі каля таго агурочніка. На зіму ўжо, гляджу, той лапік зааралі, нават большы, чым быў. Значыць, і налета будуць нешта садзіць. Незваротны працэс пайшоў...

ТЫЯ восем рублёў дзевятнаццаць капеек зямельнага падатку я заплаціла яшчэ ў жніўні і забылася. А нядаўна аддала трыццаць пяць рублёў за таксі. Трэба было ну проста тэр-мі-но-ва! пасадзіць зімовы часнок. Калі сказала пра гэта таксісту, ён не здзівіўся. І ўсю дарогу мы амаль па-сяброўску гаварылі пра тое, як гэта клопатна — мець сваю зямлю, нават невялікі яе кавалак, і як гэта... добра.

Як там у Коласа? «Зямля — аснова ўсёй Айчыне». Праз сто гадоў нічога не змянілася. Хаця хто сказаў, што павінна мяняцца?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 8 декабря 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 25 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

<table>
<tr><th>№ лота</th><th>Наименование предметов торгов</th><th>Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.</th><th>Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.</th><th>Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.</th></tr>
<tr><td colspan="5"><u>Условие продажи:</u> 1. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя.<br>2. В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %</td></tr>
<tr><td>1</td><td>Бензиновый генератор Skiper LT 8000 EB, инв. № 5503. Легковой автомобиль VOLKSWAGEN PASSAT, 2008 года выпуска, рег. знак 1088 АА-3, идентификационный номер (номер кузова, рамы) WVWZZZ3CZ9P016090, находящийся по адресу: г. Гомель, ул. Малайчука, 12</td><td>11 565,00</td><td>578,25</td><td>1 156,50</td></tr>
</table>

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 ноября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 6 декабря 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 08.06.2021 г. № 106 (29475).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Речицкого районного потребительского общества Гомельской области (продавец), в лице ликвидатора Беланова Р.Н., извещает о проведении 22 ноября 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | **Капитальное строение с инв. № 340/С-28126**, площадью **150,5 кв. м**, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж.** Адрес: г. Василевичи, ул. Комсомольская (здание гаража). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324550300001000248** общей площадью **0,4411 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания гаража. Андрей 29-665-86-34 | **3 300,00** | 330,00 |

**Продавец:** Речицкое районное потребительское общество Гомельской области, ул. Привокзальная, 2, г. Речица.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (033) 643-43-14, Перепечаев Сергей Сергеевич (ведущий бухгалтер). Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 ноября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 18 ноября 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно срокам заключенного договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 20.05.2021 г. № 93 (29462).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ДОДОМАНИЯ 2»

**Сведения о Рекламной игре:**

Наименование Рекламной игры: **«Додомания 2».**

Территория проведения: сеть ресторанов быстрого обслуживания «Додо Пицца» на территории Республики Беларусь.

Период проведения: с 16 августа 2021 г. по 19 ноября 2021 г.

В Рекламной игре приняли участие 414 участников.

Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Обладателем 1 (одного) приза «Проектор Xiaomi Mi Smart Compact Projector 1080p и денежные средства в размере 164,61 белорусских рубля» стала Голубчик Ольга Валентиновна.

Обладателями 2 (двух) призов «Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum Mop Essential и денежные средства в размере 38,03 белорусских рублей» стали Солтан Владислав Михайлович и Авсиевич Александра Геннадьевна.

Обладателями 3 (трех) призов «Мобильный телефон (смартфон) Redmi 9T (128Gb 4Gb Серый) и денежные средства в размере 47,04 белорусских рублей» стали Бурлов Максим Александрович, Свинцова Евгения Николаевна и Дубин Григорий Вячеславович.

Обладателями 10 (десяти) призов «Беспроводные наушники Xiaomi Mi True Wireless Earbuds Basic 2» стали:

| № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|
| 1 | Кузнецова Валерия Владимировна | 6 | Недоступ Екатерина Андреевна |
| 2 | Борисевич Григорий Михайлович | 7 | Лупей Максим Алексеевич |
| 3 | Кревчик Даниил Викторович | 8 | Зернова Татьяна Александровна |
| 4 | Сарвилов Андрей Витальевич | 9 | Силюк Дана Ивановна |
| 5 | Дергай Валерия Павловна | 10 | Леонкова Юлия Олеговна |

Обладателями 10 (десяти) призов «Фитнес-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (черный)» стали:

| № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|
| 1 | Маринкина Ирина Сергеевна | 6 | Бочкин Сергей Павлович |
| 2 | Ключник Ольга Сергеевна | 7 | Волынец Андрей Геннадьевич |
| 3 | Лукьянов Андрей Витальевич | 8 | Джуган Иван Эрнестович |
| 4 | Виненко Владислав Юрьевич | 9 | Воробьёва Светлана Николаевна |
| 5 | Тавгень Юлия Игоревна | 10 | Вольская Наталья Владимировна |

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМО-ИВЕНТ», 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18Б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520.

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4054 от 05.08.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры +375 29 606 75 76 с 11.00 до 23.00 ежедневно (без выходных), сайт **www.dodopizza.by.**

Правила проведения Рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 155 от 14.08.2021.

## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

### «Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения на пересечении пр-та Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске» (1-я очередь строительства)

**Застройщик Общество с ограниченной ответственностью «ГрандХаузИнжениринг»** зарегистрировано Минским горисполкомом 28.09.2017 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192975600, вносит следующие изменения в декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 09.04.2021:

**Застройщиком получены документы:**

- свидетельство о государственной регистрации земельного участка: № 500/152-10838 от 20.10.2021 г.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:**

***192 (сто девяносто две) однокомнатных квартир*** площадью от 36 до 46 кв. м: стоимость одного кв. метра от 1270–1500 долларов США.

***48 (сорок восемь) двухкомнатных квартир*** площадью от 60 до 65 кв. м: стоимость одного кв. метра от 1080–1300 долларов США.

***9 (девять) трёхкомнатных квартир*** площадью от 81 до 88 кв. м: стоимость одно кв. метра от 1080–1380 долларов США.

***6 (шесть) четырёхкомнатных квартир*** площадью от 110 до 120 кв. м: стоимость одно кв. метра от 1070–1450 долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади и условий оплаты строящегося жилого дома.

## Извещение о проведении 26 ноября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

<table>
<tr><th colspan="2">Сведения о продаваемом имуществе</th></tr>
<tr><td colspan="2">Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества: капитальное строение с инв. номером 500/С-15435 общей площадью 1 871,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 70А, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – лит. А 1-2/к, здание производственно-бытового корпуса; асфальтное покрытие на ул. Карла Либкнехта, 70А в Минске с инв. номером по бух. учету 01-450809; забор металлический с инв. номером по бух. учету 4801249; забор металлический с инв. номером по бух. учету 4801250; кран-балка с инв. номером по бух. учету 01-450811; кран подвесной 1т с инв. номером по бух. учету 01-400012; капитальное строение с инв. номером 500/С-39074 общей площадью 50,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 70А/1, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – аккумуляторная</td></tr>
<tr><td colspan="2">Сведения о земельном участке: право аренды на земельный участок по 31.03.2022, площадь – 0,5704 га, кадастровый номер 500000000005006178, целевое назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания зданий специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, специализированных зданий иного назначения</td></tr>
<tr><td>Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС: 1 696 728,34 бел. руб.</td><td>Сумма задатка: 169 000,00 бел. руб.</td></tr>
<tr><td colspan="2">Ограничения (обременения): аренда</td></tr>
</table>

**Продавец имущества** – ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. Карла Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 26.11.2021.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

При заключении договора купли-продажи недвижимого имущества ОАО «Минскремстрой» руководствуется своими имущественными интересами, уставом, локальными нормативными правовыми актами Общества, подходами по распоряжению государственным имуществом согласно Указу Президента Республики Беларусь от 10 мая 2019 г. № 169 «О распоряжении государственным имуществом» и другими нормативными правовыми актами Республики Беларусь.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **26 ноября 2021 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.11.2021 по 24.11.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 224 81 14, (017) 355 41 11.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 224 81 14, (017) 355 41 11 (ОАО «Минскремстрой»). Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

# САЎНДТРЭКІ ВІРТУАЛЬНЫХ ПРЫГОД НА ВЯЛІКАЙ СЦЭНЕ

**Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі 11 лістапада прадставіў на сцэне канцэртнай залы «Мінск» другую частку ўнікальнага музычнага шоу-праекта Video Game Symphony.**

За дзесяцігоддзе развіцця індустрыі відэагульняў музычны складнік аркад эвалюцыяніраваў ад простых лічбавых сігналаў, пераўтвораных у монафанічны гук з праграмнага коду, да маштабных электронных і сімфанічных палотнаў, якія не проста дапаўняюць гульнявую механіку, але і ствараюць непаўторную атмасферу таго альбо іншага віртуальнага падарожжа. А гэта ў сваю чаргу дапамагае развіваць лічбавае дзейства па законах кінематаграфіі.

І сёння да запісу гульнявой музыкі ўсё часцей далучаюць кампазітараў, выканаўцаў і калектывы з сусветным іменем.

Першая частка праекта Video Game Symphony стала беспрэцэдэнтным у нашай краіне вопытам пераносу на вялікую сцэну музыкі культавых віртуальных сусветаў ад «Super Mario Bros.» і «Heroes of Might and Magic» да «The Elder Scrolls» і «The Witcher». Тады артысты пад кіраўніцтвам запрошанага дырыжора Андрэя Якушава з аншлагам паказалі публіцы, як дынаміка, шматграннасць і выяўленчая вобразнасць гульнявых саўндтрэкаў у жывым сімфанічным выкананні можа ўразіць не толькі маладых хлопцаў і дзяўчат, але і тых, хто ўвогуле далёкі ад свету відэагульняў.

У праграме другой часткі Video Game Symphony Vol.2 аўдыторыя пачула каля сотні прафесійных артыстаў пад кіраўніцтвам маэстра Андрэя Якушава. У вялікім жывым канцэрце былі прадстаўлены новыя аранжыроўкі як да любімых камп'ютарных гульняў мінулых гадоў, так і да сучасных бестселераў, у ліку якіх «World of Warcraft», «Dota 2», «Diablo», «Final Fantasy», «Battlefield», «World of Tanks», «Dark Souls» і шэрагу іншых.

**Алена ДРАПКО.**

Кніжкі-навінкі для дзетак

# ...ЗУБРАНЯ ЗУБРЫЛА ЎРОКІ

**Міхася ПАЗНЯКОВА добра ведае юны чытач нашай краіны. Дзясяткі яго кніг знаходзяцца на паліцах дзіцячых і школьных бібліятэк. А новыя выданні — у кнігарнях краіны, у кіёсках з пазнакай «Белдрук» у розных гарадах, паселішчах краіны.**




«Зубраня зубрыла ўрокі, // Побач заяц касавокі // Слухаў, не скакаў, // Верш запамінаў. // А затым усім зайцам // Гэты верш расказваў сам. // Пахваліла маці зайку // Як стараннага ўсёзнайку», — такую паэтычную мініяцюру прапануе чытачу Міхась Паўлавіч у сваёй новай кнізе «Канцэрт».

Зборнік, які пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда», уключае пяць раздзелаў: вершы сабраны ў «Дамок для Рэкса»; лічылкі — у раздзел «Звон звініць на цэлы свет»; каламбуры, крылатыя выразы — «Не бывае ў Томы ўтомы»; смяшынкі, небыліцы — «На гу, дзе, канешне ж, адказы знойдзеце, адгадаць, пра каго ёсць у гэтым вершы ідзе гаворка: «Выспеў каля хаты — // Нізкі і вусаты. // Як сажнём, наробім круп, // То згатуем смачны суп». Альбо вось у гэтым творы што маецца на ўвазе: «За дарогаю на полі // Прыгажун сцяной стаіць. // Стройны, сонечны, вясёлы, // Завушніцамі звініць». Ці ў гэтым, напрыклад: «На сцяжынцы клубок — // Не адкоціш убок, // А паколеш толькі // Рукі аб іголкі». Сапраўды, з кнігай Міхася Пазнякова трэба працаваць. Заявіўшы назвай «Канцэрт» пэўнае відовішча, амаль бярозе спеюць грушы»; а загадкі — «Ног не маюць, а бягуць».

Паэт выступае вопытным мовазнаўцам, сапраўдным настаўнікам роднай мовы. Часам і смешна ад яго прыдумак, а часам яны прымушаюць спыніць хаду і задумацца, шукаючы адгадку. Паспрабуйце і вы, паважаныя чытачы, не зазіраючы пакуль у кнітэатральнае дзейства, магчыма, і захапляльнае, аўтар ад твора да твора настройвае чытача на працу душы, на суперажыванне разам з творчай фантазіяй аўтара.

Кніга падаецца выключна важным на сэнсе і важкім па эмацыянальнай нагрузцы мастацкім падручнікам. Таму раім паспяшацца набыць «Канцэрт» і настаўнікам, якія выкладаюць родную мову ў малодшых класах. Вось пабачыце, кніга стане вашым добрым памагатым.

Праілюстравала «Канцэрт» сімпатычнымі выявамі таленавіты кніжны графік Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ. Яе героі прыцягваюць, дадаюць розным старонкам кнігі яшчэ большую дынамічнасць. Сцішаныя, мяккія колеры, якімі надзелены мастацкія партрэты звяроў і птушак, дадаюць чытачу любові, ласкі да герояў, прыдуманых паэтам і вымаляваных ілюстратарам. Шкада, што кнігі такога тыпу, як «Канцэрт» Міхася Пазнякова, выдаюцца накладам усяго толькі ў 1100 экзэмпляраў. Хіба не ў кожнай школьнай бібліятэцы іх варта мець?!

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.31 | 17.15 | 8.44 |
| Віцебск — | 8.26 | 17.00 | 8.34 |
| Магілёў — | 8.21 | 17.05 | 8.44 |
| Гомель — | 8.12 | 17.08 | 8.56 |
| Гродна — | 8.45 | 17.32 | 8.47 |
| Брэст — | 8.40 | 17.38 | 8.58 |

### Месяц

*Першая квадра 11 лістапада. Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

**Пр.** *Алены, Анастасіі, Леаніда, Марка, Мацвея, Сціпана.*
**К.** *Рэнаты, Вітольда, Мацея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 12 ЛІСТАПАДА

У краіне

**1823** год — нарадзіўся (в. Шыпілавічы, цяпер у Бабруйскім раёне) Павел Міхайлавіч Шпілеўскі, беларускі этнограф, фалькларыст, пісьменнік, публіцыст, тэатральны крытык. Выступаў як даследчык і папулярызатар этнаграфіі, фальклору і гісторыі Беларусі. Аўтар нарысаў і артыкулаў «Беларускія народныя павер'і», «Народныя прыказкі з тлумачэннем паходжання і значэння іх», «Даследаванні аб ваўкалаках» і інш. Выдаў «Беларускія прыказкі», аповесць для дзяцей «Цыганя», п'есу «Дажынкі». Творы Шпілеўскага, прысвечаныя Беларусі, сцвярджалі нацыянальную самабытнасць беларускага народа, садзейнічалі фарміраванню беларускай нацыянальнай культуры і літаратуры.

**1893** год — нарадзіўся Міхаіл Паўлавіч Паруснікаў, архітэктар, педагог, акадэмік НАН Беларусі, прафесар, правадзейны член Акадэміі архітэктуры СССР. Распрацаваў праекты жылых і грамадскіх будынкаў для многіх гарадоў СССР, асноўныя прынцыпы і прыёмы планіроўкі і забудовы вясковых населеных пунктаў новага тыпу. Удзельнічаў у распрацоўцы праекта планіроўкі і забудовы цэнтра, першай чаргі Ленінскага праспекта (цяпер праспект Незалежнасці) і Кастрычніцкай плошчы ў Мінску. Па яго праектах пабудаваны адміністрацыйныя будынкі, будынак Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, жылыя дамы і мост праз Свіслач, спартыўны комплекс «Дынама» і інш. Аўтар некалькіх навуковых работ па тэорыі і гісторыі архітэктуры. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1920** год — нарадзіўся (в. Борхаў Рагачоўскага раёна) Андрэй Макаёнак, драматург, народны пісьменнік Беларусі. Працаваў у часопісе «Вожык», Саюзе пісьменнікаў Беларусі, быў галоўным рэдактарам часопіса «Нёман». Пісаў гумарэскі, фельетоны, нарысы. Аўтар шырока вядомых п'ес «Трыбунал», «Таблетку пад язык», «Зацюканы апостал», «Лявоніха на арбіце» і інш. Па сцэнарыях драматурга зняты фільмы «Кандрат Крапіва», «Рагаты бастыён», «Пасля кірмашу». Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



У свеце

**1840** год — нарадзіўся Агюст Радэн (1840—1917), французскі скульптар. Аўтар работ «Бронзавы век», «Грамадзяне Кале», «Мысліцель», твораў для сімвалічнай кампазіцыі «Брама пекла».

**1888** год — на свяце друкарoў французскага горада Ліля ў выкананні рабочага хору ўпершыню быў выкананы «Інтэрнацыянал».

**1935** год — нарадзілася Людміла Гурчанка, савецкая і расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка СССР. Здымалася ў фільмах «Карнавальная ноч», «Саламяны капялюшык», «Дваццаць дзён без вайны», «Вакзал для дваіх» і інш.

**1970** год — На Індыю і пакістанскую правінцыю Усходняя Бенгалія (цяпер Бангладэш) абрынуліся цыклон і магутная прыліўная хваля. Гэта прывяло да гібелі больш як 500 тысяч чалавек.

Так гаварыў...

**ПОЛЬ ВАЛЕРЫ:**
*«Свядомасць царуе, але не правіць».*




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмны – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2990.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 лістапада 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12